# СТАТУТ АРГАНІЗАЦЫІ АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ

## І СТАТУТ МІЖНАРОДНАГА СУДА





UN75
2020 ГОД І ДАЛЕЙ
АГУЛЬНАЯ БУДУЧЫНЯ АГУЛЬНЫМІ СІЛАМІ



UN75
2020 ГОД І ДАЛЕЙ

АГУЛЬНАЯ
БУДУЧЫНЯ
АГУЛЬНЫМІ
СІЛАМІ



**Уладзімір Макей**

*Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь*

Немагчыма пераацаніць значэнне і ролю Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у сістэме міжнародных адносін. Гэты асноватворны міжнародны дагавор аб заснаванні ААН, перш за ўсё, з'яўляецца адлюстраваннем калектыўнай волі і імкнення чалавецтва да дасягнення справядлівага міру і ўсеагульнага дабрабыту.

Захаванне фундаментальных прынцыпаў, замацаваных у Статуце ААН, мае выключную важнасць для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, заахвочвання правоў чалавека, забеспячэння эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу і дасягнення ўстойлівага развіцця.

Гэты дакумент унікальны яшчэ і тым, што ўяўляе сабой яскравы прыклад паспяховага міжасобаснага ўзаемадзеяння, эфектыўнага і прафесійнага дыялогу, а таксама моцнай волі і самааддачы канкрэтных людзей – дэлегатаў Канферэнцыі Аб'яднаных Нацый па стварэнні Міжнароднай Арганізацыі ў Сан-Францыска.

Для Беларусі як краіны – заснавальніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая прымала самы непасрэдны ўдзел у распрацоўцы Статута, гэты дакумент, безумоўна, з'яўляецца найбольш важкай і аўтарытэтнай крыніцай міжнароднага права, асновай узаемадзеяння паміж краінамі.

Сёння Статут ААН перакладзены амаль на ўсе мовы свету, што падкрэслівае яго значэнне для кожнай краіны, кожнага народа.

Ганаруся, што цяпер Статут загучыць і на маёй роднай мове. Выданне Статута ААН на беларускай мове з'яўляецца пацвярджэннем яго пазачасавага значэння для мірнага суіснавання дзяржаў, нацый, народаў, дабрабыту людзей.



**Іаана Казана-Вішнявецкі**

*Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі*

Ішоў пяты год вайны, людзі ўсяго свету падлічвалі свае страты, смуткавалі аб загінуўшых любімых, стараліся выжыць і марылі пра будучыню, дзе няма заўсёднага страху, болю, голаду і небяспекі. У такой рэальнасці заснавальнікі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый сустрэліся ў красавіку 1945 года на канферэнцыі ў Сан-Францыска, дзе была заснавана не толькі новая глабальная арганізацыя, але і новы сусветны парадак на аснове агульначалавечых каштоўнасцей і абавязацельства ўсім разам абараняць усеагульны мір, бяспеку і дабрабыт.

Праз 75 гадоў мы жывём у свеце, перад якім паўстаюць новыя, розныя, але аднолькава сур’ёзныя глабальныя пагрозы.

Пытанні змены клімату, узрастаючай няроўнасці, узброеных канфліктаў, міграцыі, дэмаграфіі і хуткіх тэхналагічных змен патрабуюць эфектыўнага супрацоўніцтва паміж краінамі, рознымі часткамі грамадства і пакаленнямі. Апошняя пандэмія COVID-19 – яскравы прыклад праблемы, якая пераадольвае ўсе межы і настойліва заклікае да пашырэння глабальнага супрацоўніцтва і салідарнасці.

У сённяшнім неспакойным свеце, які хутка змяняецца і перажывае сур’ёзныя прыродныя, палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя ўзрушэнні, сістэма ААН

з’яўляецца адзінай глабальнай платформай для ўзгаднення дзеянняў нацый перад тварам надзённых праблем, звязаных з пандэміяй, і пры гэтым захоўвае доўгатэрміновую перспектыву і стымулюе інавацыі і супрацоўніцтва для вырашэння такіх надзённых праблем, як змена клімату, барацьба з няроўнасцю, ізаляцыяй, тэрарызмам і гандлем людзьмі.

Вы трымаеце ў руках спецыяльнае выданне Статута ААН, апублікаванае 26 чэрвеня 2020 г. у сувязі з 75-годдзем з дня падпісання Статута ААН, якое адбылося пасля двух месяцаў працы канферэнцыі ў Сан-Францыска ў 1945 г. Вы ўбачыце цудоўныя гістарычныя фотаздымкі і дакументы, якія адлюстроўваюць велізарную ролю Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў стварэнні Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

Чытаючы Статут, я спадзяюся, вы зразумееце, што гэта не кніга па гісторыі ці рэліктавы дакумент, які дазваляе лепш зразумець толькі мінулае. Гэта сённяшні заклік да светлай будучыні без войнаў, з поўнай павагай да асноўных правоў чалавека і з роўнымі правамі мужчын і жанчын. Гэта таксама бачанне міжнароднага супрацоўніцтва, садзейнічанне сацыяльнаму прагрэсу і павышэнню ўзроўню жыцця пры большай свабодзе. Цярпімасць, адзінства, прыхільнасць да правілаў і нормаў міжнароднага супрацоўніцтва – гэтыя каштоўнасці ляжалі і ляжаць у аснове працы ААН.

Калі мы адзначаем 75-годдзе ААН, мы звяртаем увагу на тое, што цяпер важна для людзей. Мы запытваем беларусаў, што для іх важна як у свеце, так і ў іх штодзённым жыцці. Мы ведаем, што беларусы шануюць усеагульныя мір і бяспеку і цалкам падтрымліваюць міжнароднае супрацоўніцтва і ААН. Мы таксама ведаем, што важна для іх у практычным плане і што азначае бяспека для кожнага ў свеце – гэта здароўе, адукацыя, праца і ахова прыроды. На гэтым мы пачынаем і засноўваем сваю дзейнасць дзеля лепшай будучыні з абсалютна роўнымі магчымасцямі для ўсіх.

Якім будзе свет, калі ААН споўніцца 100 гадоў? Гэта залежыць ад кожнага з нас. Кожны з нас здольны змяніць свет да лепшага. І ўсё гэта ўсяляе надзею на лепшую будучыню і паказвае, што намаганні па стварэнні аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі 75 гадоў таму былі зроблены недарэмна.

# СТАТУТ
# Арганізацыі
# Аб’яднаных
# Нацый



Кузьма Кісялёў, Народны камісар замежных спраў БССР, падпісвае Статут ААН на цырымоніі ў Доме ветэранаў ваеннага мемарыяла.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*

# ЗАЎВАГА

Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый быў падпісаны 26 чэрвеня 1945 г. у г. Сан-Францыска на заключным пасяджэнні Канферэнцыі Аб'яднаных Нацый па пытанні аб стварэнні Міжнароднай Арганізацыі і ўступіў у сілу 24 кастрычніка 1945 г. Састаўной часткай Статута з'яўляецца Статут Міжнароднага Суда.

Папраўкі да артыкулаў 23, 27 і 61 Статута былі прыняты Генеральнай Асамблеяй 17 снежня 1963 г. і ўступілі ў сілу 31 жніўня 1965 г. Папраўка да артыкула 109, прынятая Генеральнай Асамблеяй 20 снежня 1965 г., уступіла ў сілу 12 чэрвеня 1968 года.

Папраўка да артыкула 23 Статута павялічвае колькасць членаў Савета Бяспекі з адзінаццаці да пятнаццаці.

Папраўлены артыкул 27 прадугледжвае, што рашэнні Савета Бяспекі па працэдурных пытаннях лічацца прынятымі, калі за іх пададзены галасы дзевяці членаў (раней сямі), і па ўсіх іншых пытаннях – калі за іх пададзены галасы дзевяці членаў (раней сямі), уключаючы супадаючыя галасы пяці пастаянных членаў Савета Бяспекі.

Папраўка да артыкула 61 павялічвае колькасць членаў Эканамічнага і Сацыяльнага Савета з васямнаццаці да дваццаці сямі. Наступная папраўка да гэтага артыкула, што ўступіла ў сілу 24 верасня 1973 года, павялічвае колькасць членаў Савета з дваццаці сямі да пяцідзесяці чатырох.

Папраўка да першага пункта артыкула 109 прадугледжвае, што час і месца правядзення Генеральнай канферэнцыі дзяржаў-членаў з мэтай перагляду Статута вызначаюцца дзвюма трацямі галасоў членаў Генеральнай Асамблеі і галасамі любых дзевяці (раней сямі) членаў Савета Бяспекі.

Пункт 3 артыкула 109, які прадугледжвае магчымасць склікання канферэнцыі па перагляду Статута, быў разгледжаны Генеральнай Асамблеяй і Саветам Бяспекі на дзясятай чарговай сесіі Генеральнай Асамблеі ў 1955 г. і пакінуты ў яго першапачатковай фармулёўцы: «галасамі любых сямі членаў Савета Бяспекі».



# Мы, народы Аб'яднаных Нацый,

## поўныя рашучасці

пазбавіць будучыя пакаленні ад бедстваў вайны, якая двойчы ў нашым жыцці прынесла чалавецтву невыказнае гора, і

зноў умацаваць веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і вартасць чалавечай асобы, у раўнапраўе мужчын і жанчын і ў роўнасць правоў вялікіх і малых нацый, і

стварыць умовы, пры якіх могуць захоўвацца справядлівасць і павага да абавязацельстваў, што вынікаюць з дагавораў і іншых крыніц міжнароднага права, і

садзейнічаць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе,

**і з гэтай мэтай**

праяўляць цярпімасць і жыць разам, у міры адзін з другім, як добрыя суседзі, і

аб'яднаць нашы сілы для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, і

забяспечыць прыняццем прынцыпаў і ўстанаўленнем метадаў, каб узброеныя сілы прымяняліся не інакш, як у агульных інтарэсах, і

выкарыстаць міжнародны апарат для садзейнічання эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу ўсіх народаў,

**вырашылі аб'яднаць нашы намаганні для дасягнення гэтых мэт.**

Згодна з гэтым нашы адпаведныя ўрады праз сваіх прадстаўнікоў, якія сабраліся ў горадзе Сан-Францыска і прад'явілі свае паўнамоцтвы, знойдзеныя ў належнай форме, згадзіліся прыняць гэты Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і гэтым засноўваюць міжнародную арганізацыю пад назвай «Аб'яднаныя Нацыі».

# РАЗДЗЕЛ I
# МЭТЫ І ПРЫНЦЫПЫ

*Артыкул 1*

Арганізацыя Аб’яднаных Нацый мае на Мэце:

1. Падтрымліваць міжнародны мір і бяспеку і з гэтай мэтай прымаць эфектыўныя калектыўныя меры для прадухілення і ўстаранення пагрозы міру і падаўлення актаў агрэсіі або іншых парушэнняў міру, і мірнымі сродкамі, у згодзе з прынцыпамі справядлівасці і міжнароднага права, уладжваць або вырашаць міжнародныя спрэчкі або сітуацыі, якія могуць прывесці да парушэння міру;

2. Развіваць дружалюбныя адносіны паміж нацыямі на аснове павагі прынцыпу раўнапраўя і самавызначэння народаў, а таксама прымаць іншыя адпаведныя меры для ўмацавання ўсеагульнага міру;

3. Ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў вырашэнні міжнародных праблем эканамічнага, сацыяльнага, культурнага і гуманітарнага характару і ў падтрыманні і развіцці павагі да правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі, і

4. Быць цэнтрам для ўзгаднення дзеянняў нацый у дасягненні гэтых агульных мэт.

*Артыкул 2*

Для дасягнення мэт, указаных у артыкуле 1, Арганізацыя і яе Члены дзейнічаюць у адпаведнасці з наступнымі Прынцыпамі:

1. Арганізацыя заснавана на прынцыпе суверэннай роўнасці ўсіх яе Членаў;

2. Усе Члены Арганізацыі Аб’яднаных Нацый добрасумленна выконваюць прынятыя на сябе па гэтым Статуце абавязацельствы, каб забяспечыць ім усім у сукупнасці правы і перавагі, якія вынікаюць з прыналежнасці да складу Членаў Арганізацыі;

3. Усе Члены Арганізацыі Аб’яднаных Нацый вырашаюць свае міжнародныя спрэчкі мірнымі сродкамі такім чынам, каб не ставіць пад пагрозу міжнародны мір і бяспеку і справядлівасць;

4. Усе Члены Арганізацыі Аб’яднаных Нацый устрымліваюцца ў іх міжнародных адносінах ад пагрозы сілай або яе прымянення як супраць тэрытарыяльнай недатыкальнасці або палітычнай незалежнасці любой дзяржавы, так і якім-небудзь іншым чынам, несумяшчальным з Мэтамі Аб’яднаных Нацый;

5. Усе Члены Арганізацыі Аб’яднаных Нацый аказваюць ёй усямерную дапамогу ва ўсіх

дзеяннях, якія ажыццяўляюцца ёю ў адпаведнасці з гэтым Статутам, і ўстрымліваюцца ад аказання дапамогі любой дзяржаве, супраць якой Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ужывае дзеянні прэвентыўнага або прымусовага характару;

6. Арганізацыя забяспечвае, каб дзяржавы, якія з'яўляюцца яе Членамі, дзейнічалі ў адпаведнасці з гэтымі Прынцыпамі, паколькі гэта можа стаць неабходным для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі;

7. Гэты Статут ні ў якай меры не дае Арганізацыі Аб'яднаных Нацый права на ўмяшанне ў справы, якія па сутнасці ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю любой дзяржавы, і не патрабуе ад Членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ставіць такія справы на вырашэнне ў парадку гэтага Статута; аднак гэты прынцып не закранае прымянення прымусовых мер на падставе Раздзела VII.

# РАЗДЗЕЛ II

# ЧЛЕНЫ АРГАНІЗАЦЫІ

*Артыкул 3*

Першапачатковымі Членамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з'яўляюцца дзяржавы, якія, прыняўшы ўдзел у Канферэнцыі ў Сан-Францыска па стварэнні Міжнароднай Арганізацыі або раней падпісаўшы Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый ад 1 студзеня 1942 года, падпісалі і ратыфікавалі гэты Статут у адпаведнасці з артыкулам 110.

*Артыкул 4*

1. Прыём у Члены Арганізацыі адкрыты для ўсіх іншых міралюбівых дзяржаў, якія прымуць на сябе абавязацельствы, што ўтрымліваюцца ў гэтым Статуце, і якія, па меркаванні Арганізацыі, могуць і жадаюць гэтыя абавязацельствы выконваць.

2. Прыём любой такой дзяржавы ў Члены Арганізацыі праводзіцца пастановай Генеральнай Асамблеі па рэкамендацыі Савета Бяспекі.

*Артыкул 5*

Калі супраць якога-небудзь Члена Арганізацыі былі ўжыты Саветам Бяспекі дзеянні прэвентыўнага або прымусовага характару, Генеральная Асамблея мае права, па рэкамендацыі Савета Бяспекі, прыпыняць ажыццяўленне правоў і прывілей, якія належаць яму як Члену арганізацыі. Ажыццяўленне гэтых правоў і прывілей можа быць адноўлена Саветам Бяспекі.

*Артыкул 6*

Член Арганізацыі, які сістэматычна парушае прынцыпы, што ўтрымліваюцца ў гэтым Статуце, можа быць выключаны з Арганізацыі Генеральнай Асамблеяй па рэкамендацыі Савета Бяспекі.



THE CHARTER OF THE UNITED NATIONS

PREAMBLE

WE THE PEOPLES OF THE UNITED NATIONS

determined to save succeeding generations from the scourge of war, which twice in our lifetime has brought untold sorrow to mankind, and

to reaffirm faith in fundamental human rights, in the dignity and value of the human person, in the equal rights of men and women and of nations large and small, and

to establish conditions under which justice and respect for the obligations arising from treaties and other sources of international law can be maintained, and

to promote social progress and better standards of life in larger freedom,

and for these ends

to practice tolerance and live together in peace with one another as good neighbors, and

to unite our strength to maintain international peace and security, and

by the acceptance of principles and the institution of methods, to insure that armed force shall not be used, save in the common interest, and

by the employment of international machinery for the promotion of economic and social advancement of all peoples

have resolved to combine our efforts to accomplish these aims.

Accordingly, our respective governments, through representatives assembled in the City of San Francisco, who have exhibited their full powers found to be in good and due form, have agreed to the present Charter of the United Nations and do hereby establish an international organization to be known as the United Nations.

5364 (Preamble) 1

Фотакопія арыгінала падрыхтаванай да друку Прэамбулы Статута ААН.

*1 студзеня 1955 г., ААН, Нью-Ёрк*



Губернатар Каліфорніі Эрл Уорэн выступае з прамовай на першым пленарным пасяджэнні.

*26 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



4-е пленарнае пасяджэнне. У прэзідыуме Вячаслаў Молатаў, Старшыня дэлегацыі СССР. Выступае Хасэ Серата (Уругвай).

*26 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Здымкі хронікі пленарных пасяджэнняў у Оперным тэатры.

*25 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Таблічка з указаннем месца беларускай дэлегацыі адпаведна плану размяшчэння, Оперны тэатр.

*19 мая 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*

Кузьма Кісялёў, Старшыня дэлегацыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

*25 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Кузьма Кісялёў, Народны камісар замежных спраў БССР, і члены дэлегацыі. Злева направа: Фрол Шмыгаў, Уладзімір Перцаў, Кузьма Кісялёў, Антон Жэбрак, Георгій Байдакоў.

*25 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



# РАЗДЗЕЛ III

# ОРГАНЫ

*Артыкул 7*

1. У якасці галоўных органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый утвараюцца: Генеральная Асамблея, Савет Бяспекі, Эканамічны і Сацыяльны Савет, Савет па Апецы, Міжнародны Суд і Сакратарыят.

2. Дапаможныя органы, якія будуць неабходнымі, могуць утварацца ў адпаведнасці з гэтым Статутам.

*Артыкул 8*

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый не ўстанаўлівае ніякіх абмежаванняў у адносінах да права мужчын і жанчын удзельнічаць у любой якасці і на роўных умовах у яе галоўных і дапаможных органах.

# РАЗДЗЕЛ IV
# ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ

## Склад

*Артыкул 9*

1. Генеральная Асамблея складаецца з усіх Членаў Арганізацыі.

2. Кожны Член Арганізацыі мае не больш за пяць прадстаўнікоў у Генеральнай Асамблеі.

## Функцыі і Паўнамоцтвы

*Артыкул 10*

Генеральная Асамблея ўпаўнаважваецца абмяркоўваць любыя пытанні або справы ў межах гэтага Статута або тыя, якія адносяцца да паўнамоцтваў і функцый любога з органаў, прадугледжаных гэтым Статутам, і, за выключэннямі, прадугледжанымі артыкулам 12, рабіць рэкамендацыі Членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый або Савету Бяспекі або Членам Арганізацыі і Савету Бяспекі па любых такіх пытаннях або справах.

*Артыкул 11*

1. Генеральная Асамблея ўпаўнаважваецца разглядаць агульныя прынцыпы супрацоўніцтва ў справе падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, у тым ліку прынцыпы, якія вызначаюць раззбраенне і рэгуляванне ўзбраенняў, і рабіць у адносінах да гэтых прынцыпаў рэкамендацыі Членам Арганізацыі або Савету Бяспекі або і Членам Арганізацыі, і Савету Бяспекі.

2. Генеральная Асамблея ўпаўнаважваецца абмяркоўваць любыя пытанні, што адносяцца да падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, пастаўленыя перад ёю любым Членам Арганізацыі або Саветам Бяспекі або дзяржавай, якая не з'яўляецца Членам Арганізацыі, у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 35, і за выключэннямі, прадугледжанымі артыкулам 12, рабіць у адносінах да любых такіх пытанняў рэкамендацыі зацікаўленай дзяржаве або дзяржавам або Савету Бяспекі, або і Савету Бяспекі, і зацікаўленай дзяржаве або дзяржавам. Любое такое пытанне, па якім неабходна ўжыць дзеянне, перадаецца Генеральнай Асамблеяй Савету Бяспекі да абмеркавання або пасля яго.

3. Генеральная Асамблея можа звяртаць увагу Савета Бяспекі на сітуацыі, якія маглі б пагражаць міжнароднаму міру і бяспецы.

4. Паўнамоцтвы Генеральнай Асамблеі, выкладзеныя ў гэтым артыкуле, не павінны абмяжоўваць агульнага сэнсу артыкула 10.

*Артыкул 12*

1. Калі Савет Бяспекі выконвае ўскладзеныя на яго гэтым Статутам функцыі ў адносінах да якой-небудзь спрэчкі або сітуацыі, Генеральная Асамблея не можа рабіць якіх-небудзь рэкамендацый, што датычаць дадзенай спрэчкі або сітуацыі, калі Савет Бяспекі не запатрабуе гэтага.

2. Генеральны Сакратар, са згоды Савета Бяспекі, паведамляе Генеральнай Асамблеі на кожнай яе сесіі аб усіх пытаннях, якія датычаць падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, знаходзяцца на разглядзе Савета Бяспекі, і такім жа чынам паведамляе Генеральнай Асамблеі, а калі Генеральная Асамблея не засядае, то Членам Арганізацыі, неадкладна, як толькі Савет Бяспекі спыніць разгляд такіх пытанняў.

*Артыкул 13*

1. Генеральная Асамблея арганізуе даследаванні і робіць рэкамендацыі з мэтай:

a) садзейнічання міжнароднаму супрацоўніцтву ў палітычнай галіне і заахвочвання прагрэсіўнага развіцця міжнароднага права і яго кадыфікацыі;

b) садзейнічання міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне эканамічнай, сацыяльнай, культуры, адукацыі, аховы здароўя і садзейнічання ажыццяўленню правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі.

2. Далейшыя абавязкі, функцыі і паўнамоцтвы Генеральнай Асамблеі ў адносінах да пытанняў, адзначаных вышэй у пункце 1b, пералічаны ў Раздзелах IX і X.

*Артыкул 14*

З захаваннем палажэнняў артыкула 12 Генеральная Асамблея ўпаўнаважваецца рэкамендаваць меры мірнага ўладжвання любой сітуацыі, незалежна ад яе паходжання, якая, на думку Асамблеі, магла б парушыць агульны дабрабыт або дружалюбныя адносіны паміж нацыямі, уключаючы сітуацыі, што ўзнікаюць у выніку парушэння палажэнняў гэтага Статута, якія вызначаюць Мэты і Прынцыпы Аб'яднаных Нацый.

*Артыкул 15*

1. Генеральная Асамблея атрымлівае і разглядае штогоднія і спецыяльныя даклады Савета Бяспекі; гэтыя даклады павінны ўключаць справаздачу аб мерах па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі, якія Савет Бяспекі вырашыў ужыць або ўжыў.

2. Генеральная Асамблея атрымлівае і разглядае даклады іншых органаў Арганізацыі.

*Артыкул 16*

Генеральная Асамблея выконвае ў адносінах да міжнароднай сістэмы апекі такія функцыі, якія ўскладзены на яе на аснове Раздзелаў XII

і XIII, уключаючы зацвярджэнне пагадненняў па апецы для тэрыторый, не аднесеных да ліку стратэгічных.

*Артыкул 17*

1. Генеральная Асамблея разглядае і зацвярджае бюджэт Арганізацыі.

2. Члены Арганізацыі бяруць на сябе яе расходы па размеркаванні, якое ўстанаўліваецца Генеральнай Асамблеяй.

3. Генеральная Асамблея разглядае і зацвярджае любыя фінансавыя і бюджэтныя пагадненні са спецыялізаванымі ўстановамі, адзначанымі ў артыкуле 57, і правярае адміністрацыйныя бюджэты такіх спецыялізаваных устаноў з той мэтай, каб зрабіць рэкамендацыі зацікаўленым установам.

## Галасаванне

*Артыкул 18*

1. Кожны Член Генеральнай Асамблеі мае адзін голас.

2. Рашэнні Генеральнай Асамблеі па важных пытаннях прымаюцца большасцю ў дзве трэці членаў Асамблеі, якія прысутнічаюць і ўдзельнічаюць у галасаванні. Гэтыя пытанні ўключаюць: рэкамендацыі ў адносінах да падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, выбары непастаянных членаў Савета Бяспекі, выбары членаў Эканамічнага і Сацыяльнага Савета, выбары членаў Савета па Апецы, у адпаведнасці з пунктам 1с артыкула 86, прыём новых Членаў у Арганізацыю Аб’яднаных Нацый, прыпыненне правоў і прывілей Членаў Арганізацыі, выключэнне з Арганізацыі яе Членаў, пытанні, якія адносяцца да функцыянавання сістэмы апекі, і бюджэтныя пытанні.

3. Рашэнні па іншых пытаннях, уключаючы вызначэнне дадатковых катэгорый пытанняў, якія падлягаюць вырашэнню большасцю ў дзве трэці галасоў, прымаюцца простай большасцю прысутных, што ўдзельнічаюць у галасаванні.

*Артыкул 19*

Член Арганізацыі, за якім лічыцца запазычанасць па выплаце Арганізацыі грашовых узносаў, пазбаўляецца права голасу ў Генеральнай Асамблеі, калі сума яго запазычанасці роўная або перавышае суму ўзносаў, што належаць з яго за два поўныя папярэднія гады. Генеральная Асамблея можа, аднак, дазволіць такому Члену Арганізацыі ўдзельнічаць у галасаванні, калі яна прызнае, што пратэрміноўка плацяжу адбылася па не залежачых ад яго акалічнасцях.

## Працэдура

*Артыкул 20*

Генеральная Асамблея збіраецца на чарговыя штогоднія сесіі і на такія спецыяльныя сесіі, якіх могуць патрабаваць абставіны. Спецыяльныя сесіі склікаюцца Генеральным Сакратаром па патрабаванні Савета Бяспекі або большасці Членаў Арганізацыі.

*Артыкул 21*

Генеральная Асамблея ўстанаўлівае свае ўласныя правілы працэдуры. Яна выбірае свайго Старшыню на кожную сесію.

*Артыкул 22*

Генеральная Асамблея ўпаўнаважваецца ствараць такія дапаможныя органы, якія яна палічыць неабходнымі для ажыццяўлення сваіх функцый.

# РАЗДЗЕЛ V
# САВЕТ БЯСПЕКІ

## Склад

*Артыкул 23*

1. Савет Бяспекі складаецца з пятнаццаці Членаў Арганізацыі. Кітайская Рэспубліка, Францыя, Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі і Злучаныя Штаты Амерыкі з'яўляюцца пастаяннымі членамі Савета Бяспекі. Генеральная Асамблея выбірае шэсць другіх Членаў Арганізацыі ў якасці непастаянных членаў Савета Бяспекі, аддаючы асабліва належную ўвагу, у першую чаргу, ступені ўдзелу Членаў Арганізацыі ў падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі і ў дасягненні іншых мэт Арганізацыі, а таксама справядліваму геаграфічнаму размеркаванню.

2. Непастаянныя члены Савета Бяспекі выбіраюцца на двухгадовы тэрмін. Пры першых выбарах непастаянных членаў, пасля павелічэння колькасці членаў Савета Бяспекі з адзінаццаці да пятнаццаці, два з чатырох дадатковых членаў выбіраюцца тэрмінам на адзін год. Член Савета Бяспекі, які выбывае, не падлягае неадкладнаму перавыбранню.

3. Кожны член Савета Бяспекі мае аднаго прадстаўніка.

## Функцыі і Паўнамоцтвы

*Артыкул 24*

1. Для забеспячэння хуткіх і эфектыўных дзеянняў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый яе Члены ўскладаюць на Савет Бяспекі галоўную адказнасць за падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі і згаджаюцца з тым, што пры выкананні яго абавязкаў, якія вынікаюць з гэтай адказнасці, Савет Бяспекі дзейнічае ад іх імя.

2. Пры выкананні гэтых абавязкаў Савет Бяспекі дзейнічае ў адпаведнасці з Мэтамі і Прынцыпамі Аб'яднаных Нацый. Пэўныя паўнамоцтвы, дадзеныя Савету Бяспекі для выканання гэтых абавязкаў, выкладзены ў Раздзелах VI, VII, VIII і XII.

3. Савет Бяспекі прадстаўляе на разгляд Генеральнай Асамблеі штогоднія даклады і, па меры патрэбы, спецыяльныя даклады.

*Артыкул 25*

Члены Арганізацыі згаджаюцца, у адпаведнасці з гэтым Статутам, падпарадкоўвацца рашэнням Савета Бяспекі і выконваць іх.

*Артыкул 26*

З мэтай садзейнічання ўстанаўленню і падтрыманню міжнароднага міру і бяспекі з найменшым адцягненнем сусветных людскіх сіл і эканамічных рэсурсаў для справы ўзбраення Савет Бяспекі нясе адказнасць за фармуляванне, пры дапамозе Ваенна-Штабнога Камітэта, указанага ў артыкуле 47, планаў стварэння сістэмы рэгулявання ўзбраенняў для прадстаўлення іх Членам Арганізацыі.

## Галасаванне

*Артыкул 27*

1. Кожны член Савета Бяспекі мае адзін голас.

2. Рашэнні Савета Бяспекі па пытаннях працэдуры лічацца прынятымі, калі за іх пададзены галасы дзевяці членаў Савета.

3. Рашэнні Савета Бяспекі па ўсіх іншых пытаннях лічацца прынятымі, калі за іх пададзены галасы дзевяці членаў Савета, уключаючы супадаючыя галасы ўсіх пастаянных членаў Савета, прычым бок, які ўдзельнічае ў спрэчцы, павінен устрымацца ад галасавання ў час прыняцця рашэння на падставе Раздзела VI і на падставе пункта 3 артыкула 52.

## Працэдура

*Артыкул 28*

1. Савет Бяспекі арганізуецца такім чынам, каб ён мог функцыянаваць бесперапынна. Для гэтай мэты кожны член Савета Бяспекі павінен быць заўсёды прадстаўлены ў месцы знаходжання Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

2. Савет Бяспекі збіраецца на перыядычныя пасяджэнні, на якіх кожны з яго членаў можа, па сваім жаданні, быць прадстаўлены або членам урада, або якім-небудзь іншым асоба прызначаным прадстаўніком.

3. Пасяджэнні Савета Бяспекі могуць адбывацца не толькі ў месцы знаходжання Арганізацыі, але і ва ўсякім іншым месцы, якое, на думку Савета, больш спрые яго рабоце.

*Артыкул 29*

Савет Бяспекі можа ствараць такія дапаможныя органы, якія ён знойдзе неабходнымі для выканання сваіх функцый.

*Артыкул 30*

Савет Бяспекі ўстанаўлівае свае правілы працэдуры, уключаючы парадак абрання свайго Старшыні.

*Артыкул 31*

Любы Член Арганізацыі, які не з'яўляецца членам Савета Бяспекі, можа прыняць удзел, без права голасу, у абмеркаванні любога пытання, унесенага ў Савет Бяспекі, ва ўсіх тых выпадках, калі Савет Бяспекі лічыць, што інтарэсы гэтага Члена Арганізацыі спецыяльна закранутыя.

*Артыкул 32*

Любы Член Арганізацыі, які не з'яўляецца членам Савета Бяспекі, або любая дзяржава, якая не з'яўляецца Членам Арганізацыі, калі яны з'яўляюцца бакамі ў спрэчцы, разглядаемай Саветам Бяспекі, запрашаюцца прыняць удзел, без права голасу, у абмеркаванні, што датычыць гэтай спрэчкі. Савет Бяспекі ставіць такія ўмовы для ўдзелу дзяржавы, нячлена Арганізацыі, якія ён знойдзе справядлівымі.

Агульныя палажэнні; Прэамбула, мэты, прынцыпы. Пасяджэнне камітэта. Перакладчыкі слухаюць выступ дакладчыка Фарыда Зейнэдзіна (Сірыя).

*12 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Члены Камісіі IV (Судовы лад), Камітэта 1 (Міжнародны Суд Справядлівасці). Справа: Вячаслаў Формашаў, памочнік Народнага камісара замежных спраў БССР.

*25 красавіка 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*






Пасяджэнне Камісіі II (Генеральная Асамблея), Камітэта 3 (Эканамічнае і сацыяльнае супрацоўніцтва). Справа: Георгій Байдакоў, дэлегат БССР.

*6 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Адно з пленарных пасяджэнняў.

*1 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Момант напружанасці на пасяджэнні Камісіі I (Агульныя палажэнні), Камітэта 2 (Агульнае членства).

*15 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Дакументы канферэнцыі скампанаваныя на стале, 4 паверх Дома ветэранаў.

*1 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Міжнародны камутатар на цокальным паверсе Дома ветэранаў. У перыяды найбольшай нагрузкі аператары абслугоўваюць да 2000 званкоў у гадзіну.

*1 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Персанал канферэнцыі.

*1 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*

# РАЗДЗЕЛ VI

# МІРНАЕ ВЫРАШЭННЕ СПРЭЧАК

*Артыкул 33*

1. Бакі, якія ўдзельнічаюць у любой спрэчцы, працяг якой мог бы пагражаць падтрыманню міжнароднага міру і бяспекі, павінны перш за ўсё старацца вырашыць спрэчку шляхам перагавораў, абследавання, пасрэдніцтва, прымірэння, арбітражу, судовага разбору, звароту да рэгіянальных органаў або пагадненняў ці іншымі мірнымі сродкамі па сваім выбары.

2. Савет Бяспекі, калі ён лічыць гэта неабходным, патрабуе ад бакоў вырашэння іх спрэчкі пры дапамозе такіх сродкаў.

*Артыкул 34*

Савет Бяспекі ўпаўнаважваецца расследаваць любую спрэчку або любую сітуацыю, якая можа прывесці да міжнародных непаразуменняў або выклікаць спрэчку, для вызначэння таго, ці не можа працяг гэтай спрэчкі або сітуацыі пагражаць падтрыманню міжнароднага міру і бяспекі.

*Артыкул 35*

1. Кожны Член Арганізацыі можа давесці аб любой спрэчцы або сітуацыі, якая мае характар, указаны ў артыкуле 34, да ведама Савета Бяспекі або Генеральнай Асамблеі.

2. Дзяржава, якая не з'яўляецца Членам Арганізацыі, можа давесці да ведама Савета Бяспекі або Генеральнай Асамблеі аб любой спрэчцы, у якой яна з'яўляецца бокам, калі яна загадзя прыме на сябе ў адносінах да гэтай спрэчкі абавязацельствы мірнага вырашэння спрэчак, прадугледжаныя ў гэтым Статуце.

3. Вырашэнне Генеральнай Асамблеяй спраў, аб якіх даведзена да яе ведама на падставе гэтага артыкула, праводзіцца з улікам палажэнняў артыкулаў 11 і 12.

*Артыкул 36*

1. Савет Бяспекі ўпаўнаважваецца ў любой стадыі спрэчкі, якая мае характар, указаны ў артыкуле 33, або сітуацыі падобнага ж характару, рэкамендаваць належную працэдуру або метады ўрэгулявання.

2. Савет Бяспекі для вырашэння гэтай спрэчкі прымае пад увагу любую працэдуру, якая ўжо была прынята бакамі.

3. Робячы рэкамендацыі на аснове гэтага артыкула, Савет Бяспекі прымае таксама пад увагу, што спрэчкі юрыдычнага характару павін-

ны, як агульнае правіла, перадавацца бакамі ў Міжнародны Суд у адпаведнасці з палажэннямі Статута Суда.

### *Артыкул 37*

1. Калі бакі ў спрэчцы, якая мае характар, указаны ў артыкуле 33, не вырашаць яе пры дапамозе ўказаных у гэтым артыкуле сродкаў, яны перадаюць яе ў Савет Бяспекі.

2. Калі Савет Бяспекі лічыць, што працяг дадзенай спрэчкі сапраўды мог бы пагражаць падтрыманню міжнароднага міру і бяспекі, ён вырашае, або дзейнічаць яму на падставе артыкула 36, або рэкамендаваць такія ўмовы вырашэння спрэчкі, якія ён знойдзе падыходзячымі.

### *Артыкул 38*

Без шкоды для палажэнняў артыкулаў 33–37 Савет Бяспекі ўпаўнаважваецца, калі ўсе бакі, якія ўдзельнічаюць у любой спрэчцы, аб гэтым просяць, рабіць бакам рэкамендацыі з мэтай мірнага вырашэння гэтай спрэчкі.

# РАЗДЗЕЛ VII

## ДЗЕЯННІ Ў АДНОСІНАХ ДА ПАГРОЗЫ МІРУ, ПАРУШЭННЯЎ МІРУ І АКТАЎ АГРЭСІІ

*Артыкул 39*

Савет Бяспекі вызначае існаванне любой пагрозы міру, любога парушэння міру або акта агрэсіі і робіць рэкамендацыі або вырашае аб тым, якія меры трэба прыняць у адпаведнасці з артыкуламі 41 і 42 для падтрымання або аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі.

*Артыкул 40*

Каб прадухіліць пагоршанне сітуацыі, Савет Бяспекі ўпаўнаважваецца, перш чым зрабіць рэкамендацыі або вырашыць аб прыняцці мер, прадугледжаных артыкулам 39, запатрабаваць ад зацікаўленых бакоў выканання тых часовых мер, якія ён знойдзе неабходнымі або пажаданымі. Такія часовыя меры не павінны наносіць шкоды правам, дамаганням або становішчу зацікаўленых бакоў. Савет Бяспекі належным чынам улічвае невыкананне гэтых часовых мер.

*Артыкул 41*

Савет Бяспекі ўпаўнаважваецца вырашаць, якія меры, не звязаныя з выкарыстаннем узброеных сіл, павінны ўжывацца для ажыццяўлення яго рашэнняў, і ён можа запатрабаваць ад Членаў Арганізацыі прымянення гэтых мер. Гэтыя меры могуць уключаць поўны або частковы разрыў эканамічных адносін, чыгуначных, марскіх, паштовых, тэлеграфных, радыё або іншых сродкаў зносін, а таксама разрыў дыпламатычных адносін.

*Артыкул 42*

Калі Савет Бяспекі палічыць, што меры, прадугледжаныя ў артыкуле 41, могуць аказацца недастатковымі або ўжо сталі недастатковымі, ён упаўнаважваецца ўжываць такія дзеянні паветранымі, марскімі або сухапутнымі сіламі, якія будуць неабходны для падтрымання або аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі. Такія дзеянні могуць уключаць дэманстрацыі, блакаду і іншыя аперацыі паветраных, марскіх або сухапутных сіл Членаў Арганізацыі.

*Артыкул 43*

1. Усе Члены Арганізацыі, для таго каб унесці свой уклад у справу падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, абавязваюцца даваць у рас-

параджэнне Савета Бяспекі па яго патрабаванні і ў адпаведнасці з асобым пагадненнем або пагадненнямі неабходныя для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі ўзброеныя сілы, дапамогу і адпаведныя сродкі абслугоўвання, уключаючы права праходу.

2. Такое пагадненне або пагадненні вызначаюць колькасць і род войск, ступень іх гатоўнасці і іх агульнае размяшчэнне і характар адпушчаных сродкаў абслугоўвання і дапамогі.

3. Перагаворы аб заключэнні пагаднення або пагадненняў праводзяцца ў як мага карацейшы тэрмін па ініцыятыве Савета Бяспекі. Яны заключаюцца паміж Саветам Бяспекі і Членамі Арганізацыі або паміж Саветам Бяспекі і групамі Членаў Арганізацыі і падлягаюць ратыфікацыі дзяржавамі, якія іх падпісалі, у адпаведнасці з іх канстытуцыйнай працэдурай.

*Артыкул 44*

Калі Савет Бяспекі вырашыў прымяніць сілу, то перш чым запатрабаваць ад Члена Арганізацыі, не прадстаўленага ў Савеце, вылучэння ўзброеных сіл у мэтах выканання абавязацельстваў, прынятых ім на падставе артыкула 43, Савет Бяспекі запрашае гэтага Члена Арганізацыі, калі апошні гэтага пажадае, прыняць удзел у рашэннях Савета Бяспекі адносна выкарыстання кантынгентаў узброеных сіл дадзенага Члена Арганізацыі.

*Артыкул 45*

З мэтай забеспячэння для Арганізацыі Аб’яднаных Нацый магчымасці ўжываць тэрміновыя ваенныя мерапрыемствы Члены Арганізацыі павінны трымаць у стане неадкладнай гатоўнасці кантынгенты нацыянальных ваенна-паветраных сіл для сумесных міжнародных прымусовых дзеянняў. Колькасць і ступень гатоўнасці гэтых кантынгентаў і планы іх сумесных дзеянняў вызначаюцца Саветам Бяспекі з дапамогай Ваенна-Штабнога Камітэта ў межах, указаных у асобым пагадненні або пагадненнях, адзначаных у артыкуле 43.

*Артыкул 46*

Планы прымянення ўзброеных сіл складаюцца Саветам Бяспекі з дапамогай Ваенна-Штабнога Камітэта.

*Артыкул 47*

1. Ствараецца Ваенна-Штабны Камітэт для таго, каб даваць парады і дапамагаць Савету Бяспекі па ўсіх пытаннях, якія адносяцца да ваенных патрэб Савета Бяспекі ў справе падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, да выкарыстання войск, вылучаных у яго распараджэнне, і да камандавання імі, а таксама да рэгулявання ўзбраенняў і да магчымага раззбраення.

2. Ваенна-Штабны Камітэт складаецца з Начальнікаў Штабоў пастаянных членаў Саве-

та Бяспекі або іх прадстаўнікоў. Любы Член Арганізацыі, не прадстаўлены пастаянна ў Камітэце, запрашаецца Камітэтам супрацоўнічаць з ім, калі эфектыўнае ажыццяўленне абавязкаў Камітэта патрабуе ўдзелу гэтага Члена Арганізацыі ў рабоце Камітэта.

3. Ваенна-Штабны Камітэт, знаходзячыся ў падпарадкаванні Савета Бяспекі, нясе адказнасць за стратэгічнае кіраўніцтва любымі ўзброенымі сіламі, вылучанымі ў распараджэнне Савета Бяспекі. Пытанні, якія датычаць камандавання такімі сіламі, павінны быць распрацаваны пазней.

4. Ваенна-Штабны Камітэт можа, з дазволу Савета Бяспекі і пасля кансультацыі з належнымі рэгіянальнымі органамі, ствараць свае рэгіянальныя падкамітэты.

*Артыкул 48*

1. Дзеянні, якія патрабуюцца для выканання рашэнняў Савета Бяспекі з мэтай падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, ужываюцца ўсімі Членамі Арганізацыі або некаторымі з іх, у залежнасці ад таго, як гэта вырашыць Савет Бяспекі.

2. Такія рашэнні выконваюцца Членамі Арганізацыі непасрэдна, а таксама шляхам іх дзеянняў у адпаведных міжнародных установах, членамі якіх яны з'яўляюцца.

*Артыкул 49*

Члены Арганізацыі павінны аб'яднацца для аказання ўзаемнай дапамогі ў правядзенні мер, аб якіх прынята рашэнне Саветам Бяспекі.

*Артыкул 50*

Калі Саветам Бяспекі прымаюцца прэвентыўныя або прымусовыя меры супраць якой-небудзь дзяржавы, усякая іншая дзяржава, незалежна ад таго, ці з'яўляецца яна Членам Арганізацыі, перад якой паўстануць спецыяльныя эканамічныя праблемы, што ўзніклі ў выніку правядзення вышэйадзначаных мер, мае права кансультавацца з Саветам Бяспекі для вырашэння такіх праблем.

*Артыкул 51*

Гэты Статут ні ў якай меры не закранае неад'емнага права на індывідуальную або калектыўную самаабарону, калі адбудзецца ўзброены напад на Члена Арганізацыі, да таго часу пакуль Савет Бяспекі не прыме мер, неабходных для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі. Меры, прынятыя Членамі Арганізацыі пры ажыццяўленні гэтага права на самаабарону, павінны быць неадкладна паведамлены Савету Бяспекі і ніякім чынам не павінны закранаць паўнамоцтваў і адказнасці Савета Бяспекі, у адпаведнасці з гэтым Статутам, адносна ўжывання ў любы час такіх дзеянняў, якія ён палічыць неабходнымі для падтрымання або аднаўлення міжнароднага міру і бяспекі.

# РАЗДЗЕЛ VIII
# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ПАГАДНЕННІ

*Артыкул 52*

1. Гэты Статут ні ў якай меры не перашкаджае існаванню рэгіянальных пагадненняў або органаў для вырашэння такіх пытанняў, звязаных з падтрыманнем міжнароднага міру і бяспекі, якія падыходзяць для рэгіянальных дзеянняў, пры ўмове, што такія пагадненні або органы і іх дзейнасць сумяшчальныя з Мэтамі і Прынцыпамі Арганізацыі.

2. Члены Арганізацыі, якія заключылі такія пагадненні або склалі такія органы, павінны прыкласці ўсе свае намаганні для дасягнення мірнага вырашэння мясцовых спрэчак пры дапамозе такіх рэгіянальных пагадненняў або такіх рэгіянальных органаў да перадачы гэтых спрэчак у Савет Бяспекі.

3. Савет Бяспекі павінен заахвочваць развіццё прымянення мірнага вырашэння мясцовых спрэчак пры дапамозе такіх рэгіянальных пагадненняў ці такіх рэгіянальных органаў альбо па ініцыятыве зацікаўленых дзяржаў, альбо па сваёй уласнай ініцыятыве.

4. Гэты артыкул ні ў якай меры не закранае прымянення артыкулаў 34 і 35.

*Артыкул 53*

1. Савет Бяспекі выкарыстоўвае, дзе гэта дарэчы, такія рэгіянальныя пагадненні або органы для прымусовых дзеянняў пад яго кіраўніцтвам. Аднак ніякія прымусовыя дзеянні не ўжываюцца, у сілу гэтых рэгіянальных пагадненняў або рэгіянальнымі органамі, без паўнамоцтваў ад Савета Бяспекі, за выключэннем мер, прадугледжаных артыкулам 107, супраць любой варожай дзяржавы, як яна вызначана ў пункце 2 гэтага артыкула, або мер, прадугледжаных у рэгіянальных пагадненнях, накіраваных супраць аднаўлення агрэсіўнай палітыкі з боку любой такой дзяржавы, да таго часу, калі на Арганізацыю, па просьбе зацікаўленых Урадаў, можа быць ускладзена адказнасць за папярэджанне далейшай агрэсіі з боку такой дзяржавы.

2. Тэрмін «варожая дзяржава», як ён ужыты ў пункце 1 гэтага артыкула, адносіцца да любой дзяржавы, якая на працягу Другой сусветнай вайны з'яўлялася ворагам любой з дзяржаў, што падпісалі гэты Статут.

*Артыкул 54*

Савет Бяспекі павінен быць заўсёды поўнасцю інфармаваны аб дзеяннях, якія ўжыты або намячаюцца ў сілу рэгіянальных пагадненняў або рэгіянальнымі органамі для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі.

# РАЗДЗЕЛ IX

# МІЖНАРОДНАЕ ЭКАНАМІЧНАЕ І САЦЫЯЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

*Артыкул 55*

З мэтай стварэння ўмоў стабільнасці і дабрабыту, неабходных для мірных і дружалюбных адносін паміж нацыямі, заснаваных на павазе прынцыпу раўнапраўя і самавызначэння народаў, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый садзейнічае:

a) павышэнню ўзроўню жыцця, поўнай занятасці насельніцтва і ўмовам эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу і развіцця;

b) вырашэнню міжнародных праблем у галіне эканамічнай, сацыяльнай, аховы здароўя і падобных праблем; міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне культуры і адукацыі;

c) усеагульнай павазе і захаванню правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі.

*Артыкул 56*

Усе Члены Арганізацыі абавязваюцца ўжываць сумесныя і самастойныя дзеянні ў супрацоўніцтве з Арганізацыяй для дасягнення мэт, указаных у артыкуле 55.

*Артыкул 57*

1. Розныя спецыялізаваныя ўстановы, створаныя міжурадавымі пагадненнямі і надзеленыя шырока міжнароднай, вызначанай у іх установўчых актах, адказнасцю ў галіне эканамічнай, сацыяльнай, культуры, адукацыі, аховы здароўя і падобных галінах, будуць пастаўлены ў сувязь з Арганізацыяй у адпаведнасці з палажэннямі артыкула 63.

2. Такія ўстановы, якія будуць пастаўлены ўказаным чынам у сувязь з Арганізацыяй, называюцца ў далейшых артыкулах «спецыялізаваныя ўстановы».

*Артыкул 58*

Арганізацыя робіць рэкамендацыі па ўзгадненні палітыкі і дзейнасці спецыялізаваных устаноў.

*Артыкул 59*

Арганізацыя, у выпадку патрэбы, праяўляе ініцыятыву ў тым, каб зацікаўленыя дзяржавы пачалі перагаворы аб стварэнні любых новых спецыялізаваных устаноў, якія будуць патрэбны для выканання мэт, указаных у артыкуле 55.

*Артыкул 60*

Адказнасць за выкананне функцый Арганізацыі, указаных у гэтым Раздзеле, ускладаецца на Генеральную Асамблею і, пад кіраўніцтвам Генеральнай Асамблеі, на Эканамічны і Сацыяльны Савет, якому для гэтай мэты даюцца паўнамоцтвы, указаныя ў Раздзеле X.

# РАЗДЗЕЛ X

# ЭКАНАМІЧНЫ І САЦЫЯЛЬНЫ САВЕТ

## Склад

*Артыкул 61*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет складаецца з пяцідзесяці чатырох Членаў Арганізацыі, якія выбіраюцца Генеральнай Асамблеяй.

2. З захаваннем палажэнняў, выкладзеных у пункце 3, васямнаццаць членаў Эканамічнага і Сацыяльнага Савета выбіраюцца штогод тэрмінам на чатыры гады. Член Савета, які выбывае, можа быць перавыбраны неадкладна.

3. Пры першых выбарах пасля павелічэння колькасці членаў Эканамічнага і Сацыяльнага Савета з дваццаці сямі да пяцідзесяці чатырох, у дадатак да членаў, якія выбіраюцца замест дзесяці членаў, тэрмін паўнамоцтваў якіх канчаецца ў канцы дадзенага года, выбіраюцца дваццаць сем дадатковых членаў. Тэрмін паўнамоцтваў дзевяці з дваццаці сямі дадатковых членаў, выбраных такім чынам, канчаецца ў канцы першага года, а тэрмін паўнамоцтваў дзевяці другіх членаў – у канцы другога года, у адпаведнасці з пастановай Генеральнай Асамблеі.

4. Кожны член Эканамічнага і Сацыяльнага Савета мае аднаго прадстаўніка.

## Функцыі і Паўнамоцтвы

*Артыкул 62*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца ўжываць даследаванні і складаць даклады па міжнародных пытаннях у галіне эканамічнай, сацыяльнай, культуры, адукацыі, аховы здароўя і падобных пытаннях або схіляць да гэтага іншых, а таксама рабіць па любым з гэтых пытанняў рэкамендацыі Генеральнай Асамблеі, Членам Арганізацыі і зацікаўленым спецыялізаваным установам.

2. Савет упаўнаважваецца рабіць рэкамендацыі з мэтай заахвочвання павагі і захавання правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх.

3. Савет упаўнаважваецца падрыхтоўваць для прадстаўлення Генеральнай Асамблеі праекты канвенцый па пытаннях, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю.

4. Савет упаўнаважваецца склікаць, у адпаведнасці з правіламі, прадпісанымі Арганізацыяй, міжнародныя канферэнцыі па пытаннях, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю.

*Артыкул 63*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца ўваходзіць з любой з устаноў, указаных у артыкуле 57, у пагадненні, што вызначаюць умовы, на якіх адпаведныя ўстановы будуць пастаўлены ў сувязь з Арганізацыяй. Такія пагадненні падлягаюць зацвярджэнню Генеральнай Асамблеяй.

2. Савет упаўнаважваецца ўзгадняць дзейнасць спецыялізаваных устаноў пры дапамозе кансультацый з імі і рэкамендацый такім установам і пры дапамозе рэкамендацый Генеральнай Асамблеі і Членам Арганізацыі.

*Артыкул 64*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца прымаць адпаведныя меры для атрымання ад спецыялізаваных устаноў рэгулярных дакладаў. Савет упаўнаважваецца заключаць пагадненні з Членамі Арганізацыі і са спецыялізаванымі ўстановамі з мэтай атрымання ад іх дакладаў аб мерах, прынятых імі з мэтай выканання яго ўласных рэкамендацый і рэкамендацый Генеральнай Асамблеі па пытаннях, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю.

2. Савет упаўнаважваецца паведамляць Генеральнай Асамблеі свае заўвагі па гэтых дакладах.

*Артыкул 65*

Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца даваць Савету Бяспекі інфармацыю і, па прапанове Савета Бяспекі, абавязаны яму дапамагаць.

*Артыкул 66*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет ажыццяўляе такія функцыі, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю, у сувязі з выкананнем рэкамендацый Генеральнай Асамблеі.

2. Савет, з ухвалення Генеральнай Асамблеі, упаўнаважваецца выконваць работы па просьбе Членаў Арганізацыі і па просьбе спецыялізаваных устаноў.

3. Савет павінен выконваць такія іншыя функцыі, якія пералічаны ў другіх частках гэтага Статута або якія могуць быць ускладзены на яго Генеральнай Асамблеяй.

## Галасаванне

*Артыкул 67*

1. Кожны член Эканамічнага і Сацыяльнага Савета мае адзін голас.

2. Рашэнні Эканамічнага і Сацыяльнага Савета прымаюцца большасцю галасоў членаў Савета, якія прысутнічаюць і ўдзельнічаюць у галасаванні.

## Працэдура

*Артыкул 68*

Эканамічны і Сацыяльны Савет стварае камісіі ў эканамічнай і сацыяльнай галіне і па падтрыманні правоў чалавека, а таксама такія іншыя камісіі, якія могуць спатрэбіцца для выканання яго функцый.

*Артыкул 69*

Эканамічны і Сацыяльны Савет запрашае любога Члена Арганізацыі ўдзельнічаць без права голасу ў абмеркаванні ім любога пытання, якое мае асобую цікавасць для дадзенага Члена Арганізацыі.

*Артыкул 70*

Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца праводзіць мерапрыемствы для ўдзелу, без права голасу, прадстаўнікоў спецыялізаваных установаў у абмеркаванні пытанняў у Савеце або ў створаных ім камісіях, а таксама для ўдзелу прадстаўнікоў Савета ў абмеркаванні пытанняў у спецыялізаваных установах.

*Артыкул 71*

Эканамічны і Сацыяльны Савет упаўнаважваецца праводзіць належныя мерапрыемствы для кансультацый з няўрадавымі арганізацыямі, зацікаўленымі ў пытаннях, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю. Такія мерапрыемствы могуць быць умоўлены з міжнароднымі арганізацыямі, а ў выпадку патрэбы – з нацыянальнымі арганізацыямі пасля кансультацыі з зацікаўленым Членам Арганізацыі.

*Артыкул 72*

1. Эканамічны і Сацыяльны Савет устанаўлівае свае ўласныя правілы працэдуры, уключаючы парадак абрання свайго Старшыні.

2. Эканамічны і Сацыяльны Савет склікаецца па меры патрэбы, у адпаведнасці са сваімі правіламі, якія павінны ўключаць палажэнні аб скліканні пасяджэнняў па патрабаванні большасці яго членаў.

# РАЗДЗЕЛ XI

# ДЭКЛАРАЦЫЯ Ў АДНОСІНАХ ДА НЕСАМАКІРАВАЛЬНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ

*Артыкул 73*

Члены Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якія нясуць або прымаюць на сябе адказнасць за кіраванне тэрыторыямі, народы якіх не дасягнулі яшчэ поўнага самакіравання, прызнаюць той прынцып, што інтарэсы насельніцтва гэтых тэрыторый з'яўляюцца першаступеннымі і, як свяшчэнны абавязак, прымаюць абавязацельства максімальна садзейнічаць дабрабыту насельніцтва гэтых тэрыторый у рамках сістэмы міжнароднага міру і бяспекі, устаноўленай гэтым Статутам, і з гэтай мэтай:

a) забяспечваць, захоўваючы належную павагу да культуры ўказаных народаў, іх палітычны, эканамічны і сацыяльны прагрэс, прагрэс у галіне адукацыі, справядлівае абыходжанне з імі і абарону іх ад злоўжыванняў;

b) развіваць самакіраванне, улічваць належным чынам палітычныя імкненні гэтых народаў і дапамагаць ім у прагрэсіўным развіцці іх свабодных палітычных інстытутаў у адпаведнасці са спецыфічнымі акалічнасцямі, уласцівымі кожнай тэрыторыі і яе народам, і з іх рознымі ступенямі развіцця;

c) умацоўваць міжнародны мір і бяспеку;

d) садзейнічаць развіццю стваральных мерапрыемстваў, заахвочваць даследаванні і супрацоўнічаць адзін з другім і, дзе і калі гэта дарэчы, са спецыялізаванымі міжнароднымі арганізацыямі дзеля практычнага дасягнення выкладзеных у гэтым артыкуле сацыяльных, эканамічных і навуковых мэт, і

e) перадаваць рэгулярна Генеральнаму Сакратару для інфармацыі і з такім абмежаваннем, якое можа спатрэбіцца па меркаваннях бяспекі і канстытуцыйнага парадку, статыстычную і іншую інфармацыю спецыяльнага характару, якая адносіцца да эканамічных і сацыяльных умоў, а таксама ўмоў адукацыі на тэрыторыях, за якія яны адпаведна нясуць адказнасць, апрача тых тэрыторый, на якія пашыраецца дзеянне Раздзелаў XII і XIII.

*Артыкул 74*

Члены Арганізацыі таксама згаджаюцца, што іх палітыка ў адносінах да тэрыторый, на якія пашыраецца дзеянне гэтага Раздзела, павінна быць заснавана не менш, чым у адносінах да іх метраполій, на агульным прынцыпе добрасуседства, з належным улікам інтарэсаў і дабрабыту астатняга свету ў справах сацыяльных, эканамічных і гандлю.



Хвіліна маўчання на пасяджэнні Выканаўчага камітэта ў гонар перамогі ў Еўропе.

*9 мая 1945 г.,*
*Сан-Францыска, ЗША*



Прыём для афіцэраў у генерал-маёра Прата, камандуючага Заходняй ваеннай акругай. Гутарка савецкіх і амерыканскіх афіцэраў.

*22 мая 1945 г.,*
*Сан-Францыска, ЗША*

Прыём для афіцэраў у генерал-маёра Прата, камандуючага Заходняй ваеннай акругай. Група савецкіх і амерыканскіх афіцэраў і салдат.

*22 мая 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Арганізаваны савецкай дэлегацыяй прыём у гатэлі «Сент-Фрэнсіс» з нагоды перамогі над Германіяй.

*25 мая 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*





Кузьма Кісялёў, Народны камісар замежных спраў, Старшыня дэлегацыі БССР, выступае з прамовай на званым абедзе ў гатэлі «Марк Хопкінс».

*26 мая 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Андрэй Грамыка (злева), СССР, размаўляе з сенатарам Томам Коналі (ЗША) на пасяджэнні Камісіі II (Савет Бяспекі), Камітэта 1 (Структуры і працэдуры).

*14 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*

Энтані Ідэн (Вяліка-
брытанія), Эдвард Стэ-
цініус-малодшы (ЗША),
Вячаслаў Молатаў
(СССР) і Сун Цзы-Вэнь
(Кітай), злева направа,
неафіцыйная сустрэча.

*1 чэрвеня 1945 г.,
Сан-Францыска, ЗША*



Фельдмаршал Ян Смэтс
звяртаецца да аўдыторыі
на адкрыцці памятнай
дошкі ў гонар прэзідэнта
ЗША Франкліна Рузвель-
та, галоўнага ствараль-
ніка ААН.

*25 чэрвеня 1945 г.,
Сан-Францыска, ЗША*



# РАЗДЗЕЛ XII
# МІЖНАРОДНАЯ СІСТЭМА АПЕКІ

*Артыкул 75*

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый стварае пад сваім кіраўніцтвам міжнародную сістэму апекі для кіравання тымі тэрыторыямі, якія могуць быць уключаны ў яе далейшымі індывідуальнымі пагадненнямі, і для назірання за гэтымі тэрыторыямі. Гэтыя тэрыторыі называюцца далей «тэрыторыі пад апекай».

*Артыкул 76*

Асноўныя задачы сістэмы апекі, у адпаведнасці з Мэтамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, выкладзенымі ў артыкуле 1 гэтага Статута, заключаюцца ў тым, каб:

a) умацоўваць міжнародны мір і бяспеку;

b) садзейнічаць палітычнаму, эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу насельніцтва тэрыторый пад апекай, яго прагрэсу ў галіне адукацыі і яго прагрэсіўнаму развіццю ў напрамку да самакіравання або незалежнасці, як гэта можа аказацца падыходзячым для спецыфічных умоў кожнай тэрыторыі і яе народаў і маючы на ўвазе свабодна выказанае жаданне гэтых народаў, і як гэта можа быць прадугледжана ўмовамі кожнага пагаднення аб апецы;

c) падтрымліваць павагу правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі, і падтрымліваць прызнанне ўзаемазалежнасці народаў свету;

d) забяспечваць роўныя адносіны да Членаў Арганізацыі і іх грамадзян у галіне сацыяльнай, эканамічнай і гандлёвай, а таксама роўныя адносіны да іх у здзяйсненні правасуддзя без шкоды для дасягнення вышэйадзначаных задач і пры ўмове захавання палажэнняў артыкула 80.

*Артыкул 77*

1. Сістэма апекі пашыраецца на такія тэрыторыі з ніжэйпералічаных катэгорый, якія могуць быць уключаны ў яе пагадненнямі аб апецы:

a) тэрыторыі, якія цяпер знаходзяцца пад мандатам;

b) тэрыторыі, якія могуць быць адабраны ад варожых дзяржаў у выніку Другой сусветнай вайны, і

c) тэрыторыі, добраахвотна ўключаныя ў сістэму апекі дзяржавамі, адказнымі за іх кіраванне.

2. Пытанне аб тым, якія з тэрыторый вышэйпералічаных катэгорый павінны быць уключаны ў сістэму апекі і на якіх умовах, будзе прадметам наступнага пагаднення.

*Артыкул 78*

Сістэма апекі не пашыраецца на краіны, што сталі Членамі Арганізацыі, адносіны паміж якімі павінны грунтавацца на павазе прынцыпу суверэннай роўнасці.

*Артыкул 79*

Умовы апекі для кожнай тэрыторыі, якая падлягае ўключэнню ў сістэму апекі, у тым ліку ўсе змяненні і папраўкі, вызначаюцца пагадненнямі непасрэдна зацікаўленых дзяржаў, уключаючы краіны-мандатарыі, у тым выпадку, калі тэрыторыі знаходзяцца пад мандатам аднаго з Членаў Арганізацыі, і зацвярджаюцца ў артыкулах 83 і 85.

*Артыкул 80*

1. За выключэннем выпадкаў, якія могуць быць узгоднены ў індывідуальных пагадненнях аб апецы, заключаных згодна з артыкуламі 77, 79 і 81, якія ўключаюць кожную тэрыторыю ў сістэму апекі, і аж да заключэння такіх пагадненняў, нішто ў гэтым Раздзеле не павінна тлумачыцца як змяненне якім-небудзь чынам якіх бы там ні было правоў любых дзяржаў або любых народаў ці ўмоў існуючых міжнародных пагадненняў, удзельнікамі якіх могуць быць адпаведна Члены Арганізацыі.

2. Пункт 1 гэтага артыкула не павінен тлумачыцца як пункт, які дае падставы для затрымкі або адтэрміноўкі перагавораў і заключэння пагадненняў аб уключэнні падмандатных і іншых тэрыторый у сістэму апекі, як гэта прадугледжана ў артыкуле 77.

*Артыкул 81*

Пагадненне аб апецы ў кожным выпадку павінна ўключаць умовы, на якіх будзе кіравацца тэрыторыя пад апекай, а таксама вызначаць уладу, якая будзе ажыццяўляць кіраванне тэрыторыі пад апекай. Такая ўлада, якая называецца далей кіруючай уладай, можа прадстаўляць сабой адну або больш дзяржаў або Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, як такую.

*Артыкул 82*

У любым пагадненні аб апецы можа вызначацца стратэгічны раён ці раёны, што могуць уключаць частку або ўсю тэрыторыю пад апекай, на якую пашыраецца пагадненне, без шкоды для якога б там ні было асобага пагаднення ці пагадненняў, заключаных на падставе артыкула 43.

*Артыкул 83*

1. Усе функцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якія датычаць стратэгічных раёнаў, уключаючы зацвярджэнне ўмоў пагадненняў аб апецы і іх змяненняў або паправак да іх, ажыццяўляюцца Саветам Бяспекі.

2. Асноўныя мэты, выкладзеныя ў артыкуле 76, адносяцца да народа кожнага са стратэгічных раёнаў.

3. Савет Бяспекі, захоўваючы ўмовы пагадненняў аб апецы і без шкоды для патрабаванняў бяспекі, карыстаецца дапамогай Савета па Апецы для выканання тых функцый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у адпаведнасці з сістэмай апекі, якія адносяцца да палітычных, эканамічных і сацыяльных пытанняў, а таксама да пытанняў у галіне адукацыі ў стратэгічных раёнах.

*Артыкул 84*

Абавязкам кіруючай улады з'яўляецца забеспячэнне таго, каб тэрыторыя пад апекай адыгрывала сваю ролю ў падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі. З гэтай мэтай кіруючая ўлада ўпаўнаважваецца выкарыстаць добраахвотныя ўзброеныя сілы, сродкі абслугоўвання і дапамогу тэрыторыі пад апекай пры выкананні абавязацельстваў, прынятых у гэтых адносінах кіруючай уладай перад Саветам Бяспекі, а таксама і для мясцовай абароны і падтрымання закону і парадку ў межах тэрыторыі пад апекай.

*Артыкул 85*

1. Функцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у адносінах да пагадненняў аб апецы для ўсіх раёнаў, не аднесеных да ліку стратэгічных, уключаючы зацвярджэнне ўмоў пагадненняў аб апецы і іх змяненняў або папраўак да іх, ажыццяўляюцца Генеральнай Асамблеяй.

2. Савет па Апецы, які дзейнічае пад кіраўніцтвам Генеральнай Асамблеі, дапамагае Генеральнай Асамблеі выконваць гэтыя функцыі.

# РАЗДЗЕЛ XIII
# САВЕТ ПА АПЕЦЫ

## Склад

*Артыкул 86*

1. Савет па Апецы складаецца з наступных Членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый:

a) тых Членаў Арганізацыі, якія кіруюць тэрыторыямі пад апекай;

b) тых Членаў Арганізацыі, пайменаваных у артыкуле 23, якія не кіруюць тэрыторыямі пад апекай;

c) такой колькасці іншых Членаў Арганізацыі, выбраных Генеральнай Асамблеяй на трохгадовы тэрмін, якая можа стаць неабходнай для забеспячэння таго, каб агульная колькасць членаў Савета па Апецы размяркоўвалася пароўну паміж Членамі Арганізацыі, якія кіруюць і не кіруюць тэрыторыямі пад апекай.

2. Кожны член Савета па Апецы прызначыць адну асабліва кваліфікаваную асобу, якая будзе яго прадстаўніком у Савеце па Апецы.

## Функцыі і Паўнамоцтвы

*Артыкул 87*

Генеральная Асамблея і Савет па Апецы, які знаходзіцца пад яе кіраўніцтвам, пры выкананні сваіх функцый упаўнаважваюцца:

a) разглядаць справаздачы, што падаюцца кіруючай уладай;

b) прымаць петыцыі і разглядаць іх, кансультуючыся з кіруючай уладай;

c) наладжваць перыядычныя наведванні адпаведных тэрыторый пад апекай ва ўзгодненыя з кіруючай уладай тэрміны, і

d) рабіць адзначаныя і іншыя дзеянні ў адпаведнасці з умовамі пагадненняў аб апецы.

*Артыкул 88*

Савет па Апецы распрацоўвае анкету адносна палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу насельніцтва кожнай тэрыторыі пад апекай, а таксама яго прагрэсу ў галіне адукацыі, а кіруючая ўлада кожнай тэрыторыі пад апекай, якая ўваходзіць у кампетэнцыю Генеральнай Асамблеі, падае апошняй штогоднія даклады на аснове гэтай анкеты.

## Галасаванне

*Артыкул 89*

1. Кожны член Савета па Апецы мае адзін голас.

2. Рашэнні Савета па Апецы прымаюцца большасцю галасоў членаў Савета, якія прысутнічаюць і ўдзельнічаюць у галасаванні.

## Працэдура

*Артыкул 90*

1. Савет па Апецы прымае свае ўласныя правілы працэдуры, уключаючы парадак абрання свайго Старшыні.

2. Пасяджэнні Савета па Апецы склікаюцца па меры патрэбы ў адпаведнасці з яго правіламі працэдуры, якія павінны прадугледжваць скліканне пасяджэнняў па патрабаванні большасці членаў Савета.

*Артыкул 91*

Савет па Апецы карыстаецца ў адпаведных выпадках дапамогай Эканамічнага і Сацыяльнага Савета і спецыялізаваных устаноў у адносінах да пытанняў, у якіх яны адпаведна зацікаўлены.

# РАЗДЗЕЛ XIV
# МІЖНАРОДНЫ СУД

*Артыкул 92*

Міжнародны Суд з'яўляецца галоўным судовым органам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Ён дзейнічае ў адпаведнасці з прыкладаемым Статутам, які заснаваны на Статуце Пастаяннай Палаты Міжнароднага Правасуддзя і ўтварае неад'емную частку Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

*Артыкул 93*

1. Усе Члены Арганізацыі з'яўляюцца ipso facto ўдзельнікамі Статута Міжнароднага Суда.

2. Дзяржава, якая не з'яўляецца Членам Арганізацыі, можа стаць удзельнікам Статута Міжнароднага Суда на ўмовах, якія вызначаюцца, у кожным асобным выпадку, Генеральнай Асамблеяй па рэкамендацыі Савета Бяспекі.

*Артыкул 94*

1. Кожны Член Арганізацыі абавязваецца выканаць рашэнне Міжнароднага Суда па той справе, у якой ён з'яўляецца бокам.

2. У выпадку, калі які-небудзь бок у справе не выканае абавязацельства, ускладзенага на яго рашэннем Суда, другі бок можа звярнуцца ў Савет Бяспекі, які можа, калі прызнае гэта неабходным, зрабіць рэкамендацыі або рашыць аб прыняцці мер для прывядзення рашэння ў выкананне.

*Артыкул 95*

Гэты Статут ні ў якім разе не перашкаджае Членам Арганізацыі даручаць вырашэнне сваіх рознагалоссяў іншым судам, у выніку ўжо існуючых пагадненняў або такіх, якія могуць быць заключаны ў будучым.

*Артыкул 96*

1. Генеральная Асамблея або Савет Бяспекі могуць запытваць ад Міжнароднага Суда кансультацыйныя заключэнні па любым юрыдычным пытанні.

2. Іншыя органы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і спецыялізаваныя ўстановы, якім Генеральная Асамблея можа даць у любы час дазвол на гэта, таксама могуць запытваць кансультацыйныя заключэнні Суда па юрыдычных пытаннях, што ўзнікаюць у межах іх круга дзейнасці.

# РАЗДЗЕЛ XV
# САКРАТАРЫЯТ

*Артыкул 97*

Сакратарыят складаецца з Генеральнага Сакратара і такога персаналу, які можа спатрэбіцца для Арганізацыі. Генеральны Сакратар прызначаецца Генеральнай Асамблеяй па рэкамендацыі Савета Бяспекі. Генеральны Сакратар з'яўляецца галоўнай адміністрацыйнай службовай асобай Арганізацыі.

*Артыкул 98*

Генеральны Сакратар дзейнічае ў гэтай якасці на ўсіх пасяджэннях Генеральнай Асамблеі, Савета Бяспекі, Эканамічнага і Сацыяльнага Савета і Савета па Апецы і выконвае такія іншыя функцыі, якія ўскладаюцца на яго гэтымі органамі. Генеральны Сакратар падае Генеральнай Асамблеі штогоднюю справаздачу аб рабоце Арганізацыі.

*Артыкул 99*

Генеральны Сакратар мае права даводзіць да ведама Савета Бяспекі аб любых пытаннях, якія, на яго думку, могуць пагражаць падтрыманню міжнароднага міру і бяспекі.

*Артыкул 100*

1. Пры выкананні сваіх абавязкаў Генеральны Сакратар і персанал Сакратарыята не павінны запытваць або атрымліваць указанняў ад якога б ні было ўрада ці ўлады, пабочнай для Арганізацыі. Яны павінны ўстрымлівацца ад любых дзеянняў, якія маглі б адбіцца на іх становішчы як міжнародных службовых асоб, адказных толькі перад Арганізацыяй.

2. Кожны член Арганізацыі абавязваецца паважаць строга міжнародны характар абавязкаў Генеральнага Сакратара і персаналу Сакратарыята і не спрабаваць рабіць на іх уплыву пры выкананні імі сваіх абавязкаў.

*Артыкул 101*

1. Персанал Сакратарыята прызначаецца Генеральным Сакратаром, згодна з правіламі, якія ўстанаўліваюцца Генеральнай Асамблеяй.

2. Належны персанал вылучаецца для пастаяннай работы ў Эканамічны і Сацыяльны Савет, у Савет па Апецы і, па меры патрэбы, у іншыя органы Арганізацыі. Гэты персанал складае частку Сакратарыята.

3. Пры прыёме на службу і вызначэнні ўмоў службы трэба кіравацца, галоўным чынам, неабходнасцю забяспечыць высокі ўзровень працаздольнасці, кампетэнтнасці і добрасумленнасці. Належную ўвагу трэба надаваць важнасці падбору персаналу на як мага больш шырокай геаграфічнай аснове.

# РАЗДЗЕЛ XVI
# РОЗНЫЯ ПАСТАНОВЫ

### *Артыкул 102*

1. Усякі дагавор і ўсякае міжнароднае пагадненне, заключанае любым Членам Арганізацыі пасля ўступлення ў сілу гэтага Статута, павінны быць, пры першай магчымасці, зарэгістраваны ў Сакратарыяце і ім апублікаваны.

2. Ні адзін з бакоў у любым такім дагаворы або міжнародным пагадненні, не зарэгістраваных у адпаведнасці з пунктам 1 гэтага артыкула, не можа спасылацца на такі дагавор або пагадненне ні ў адным з органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

### *Артыкул 103*

У тым выпадку, калі абавязацельствы Членаў Арганізацыі па гэтым Статуце акажуцца ў супярэчнасці з іх абавязацельствамі па якім-небудзь іншым міжнародным пагадненні, пераважную сілу маюць абавязацельствы па гэтым Статуце.

### *Артыкул 104*

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый карыстаецца на тэрыторыі кожнага са сваіх Членаў такой праваздольнасцю, якая можа стаць неабходнай для выканання яе функцый і дасягнення яе мэт.

### *Артыкул 105*

1. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый карыстаецца на тэрыторыі кожнага са сваіх Членаў такімі прывілеямі і імунітэтамі, якія неабходны для дасягнення яе мэт.

2. Прадстаўнікі Членаў Арганізацыі і яе службовыя асобы таксама карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі, якія неабходны для самастойнага выканання імі сваіх функцый, звязаных з дзейнасцю Арганізацыі.

3. Генеральная Асамблея можа рабіць рэкамендацыі для вызначэння дэталей прымянення пунктаў 1 і 2 гэтага артыкула, а таксама можа прапанаваць Членам Арганізацыі канвенцыі для гэтай мэты.

# РАЗДЗЕЛ XVII
# МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА БЯСПЕЦЫ Ў ПЕРАХОДНЫ ПЕРЫЯД

*Артыкул 106*

У далейшым да ўступлення ў сілу такіх адзначаных у артыкуле 43 асобных пагадненняў, якія, на думку Савета Бяспекі, даюць яму магчымасць пачаць ажыццяўленне сваіх абавязкаў, згодна з артыкулам 42, удзельнікі Дэкларацыі Чатырох Дзяржаў, падпісанай у Маскве 30 кастрычніка 1943 г., і Францыя будуць, у адпаведнасці з палажэннямі пункта 5 гэтай Дэкларацыі, кансультавацца адно з другім і, у выпадку неабходнасці, з іншымі Членамі Арганізацыі з мэтай такіх сумесных дзеянняў ад імя Арганізацыі, якія могуць стаць неабходнымі для падтрымання міжнароднага міру і бяспекі.

*Артыкул 107*

Гэты Статут ні ў якім разе не пазбаўляе юрыдычнай сілы дзеянні, пачатыя або санкцыянаваныя ў выніку Другой сусветнай вайны ўрадамі, якія нясуць адказнасць за такія дзеянні, у адносінах да любой дзяржавы, якая на працягу Другой сусветнай вайны была ворагам любой з дзяржаў, што падпісалі гэты Статут, а таксама не перашкаджае такім дзеянням.

# РАЗДЗЕЛ XVIII
# ПАПРАЎКІ

*Артыкул 108*

Папраўкі да гэтага Статута ўваходзяць у сілу для ўсіх Членаў Арганізацыі, пасля таго як яны прыняты дзвюма трацямі галасоў членаў Генеральнай Асамблеі і ратыфікаваны, у адпаведнасці з іх канстытуцыйнай працэдурай, дзвюма трацямі Членаў Арганізацыі, уключаючы ўсіх пастаянных членаў Савета Бяспекі.

*Артыкул 109*

1. З мэтай перагляду гэтага Статута можа быць склікана Генеральная Канферэнцыя Членаў Арганізацыі ў тэрмін і ў месцы, якія павінны быць вызначаны дзвюма трацямі галасоў членаў Генеральнай Асамблеі і галасамі любых дзевяці членаў Савета Бяспекі. Кожны Член Арганізацыі будзе мець на Канферэнцыі адзін голас.

2. Любое змяненне гэтага Статута, рэкамендаванае дзвюма трацямі галасоў удзельнікаў Канферэнцыі, увойдзе ў сілу пасля ратыфікацыі, у адпаведнасці з іх канстытуцыйнай працэдурай, дзвюма трацямі Членаў Арганізацыі, уключаючы ўсіх пастаянных членаў Савета Бяспекі.

3. Калі такая Канферэнцыя не адбудзецца да дзясятай штогодняй сесіі Генеральнай Асамблеі, лічачы з дня ўступлення гэтага Статута ў сілу, прапанова склікаць такую Канферэнцыю ўключаецца ў парадак дня дадзенай сесіі Генеральнай Асамблеі, і Канферэнцыя склікаецца, калі гэта будзе вырашана простай большасцю галасоў членаў Генеральнай Асамблеі і галасамі любых сямі членаў Савета Бяспекі.

# РАЗДЗЕЛ XIX
# РАТЫФІКАЦЫЯ І ПАДПІСАННЕ

*Артыкул 110*

1. Гэты Статут падлягае ратыфікацыі дзяржавамі, якія яго падпісалі, у адпаведнасці з іх канстытуцыйнай працэдурай.

2. Ратыфікацыйныя граматы павінны здавацца на захоўванне Ураду Злучаных Штатаў Амерыкі, які будзе паведамляць аб здачы на захоўванне кожнай граматы ўсе дзяржавы, што падпісалі Статут, гэтак жа, як і Генеральнага Сакратара Арганізацыі, калі ён будзе прызначаны.

3. Гэты Статут увойдзе ў сілу пасля здачы на захоўванне ратыфікацыйных грамат Кітайскай Рэспублікай, Францыяй, Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Злучаным Каралеўствам Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі і Злучанымі Штатамі Амерыкі і большасцю іншых дзяржаў, якія падпісалі Статут. Пасля гэтага Урадам Злучаных Штатаў Амерыкі будзе складзены пратакол аб здачы на захоўванне ратыфікацыйных грамат, копіі з якога будуць разасланы ўсім дзяржавам, што падпісалі Статут.

4. Дзяржавы, якія падпісалі гэты Статут і ратыфікуюць яго пасля таго, як ён увойдзе ў сілу, стануць Першапачатковымі Членамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з дня здачы імі на захоўванне сваіх адпаведных ратыфікацыйных грамат.

*Артыкул 111*

Гэты Статут, кітайскі, французскі, рускі, англійскі і іспанскі тэксты якога з'яўляюцца роўна аўтэнтычнымі, будзе захоўвацца ў архіве Урада Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэты ўрад пасылае копіі Статута, належным чынам завераныя, Урадам усіх іншых дзяржаў, якія яго падпісалі.

У ЗАСВЕДЧАННЕ ЧАГО прадстаўнікі Урадаў Аб'яднаных Нацый падпісалі гэты Статут.

СКЛАДЗЕНА ў горадзе Сан-Францыска чэрвеня дваццаць шостага дня, тысяча дзевяцьсот сорак пятага года.

Эдвард Стэцініус-малодшы, Старшыня дэлегацыі ЗША, уручае малаток старшыні Андрэю Грамыку, СССР, на апошнім пасяджэнні Канферэнцыі.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Уладзімір Перцаў, прафесар, член Акадэміі навук БССР, член дэлегацыі БССР, падпісвае Статут ААН.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*





Антон Жэбрак, прафесар, член Акадэміі навук БССР, член дэлегацыі БССР, падпісвае Статут ААН.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Дзмітрый Мануільскі, Старшыня дэлегацыі УССР, падпісвае Статут ААН на цырымоніі ў Доме ветэранаў ваеннага мемарыяла.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Андрэй Грамыка, пасол СССР у ЗША, член дэлегацыі СССР, падпісвае Статут ААН на цырымоніі ў Доме ветэранаў ваеннага мемарыяла.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



Эдвард Стэцініус-малодшы, Дзяржаўны сакратар і Старшыня дэлегацыі ЗША, на падпісанні Статута ААН на цырымоніі ў Доме ветэранаў ваеннага мемарыяла.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*

Жазэф Поль-Банкур, былы прэм'ер-міністр Францыі, падпісвае Статут ААН.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*




Граф Галіфакс, пасол Вялікабрытаніі ў ЗША, член дэлегацыі Вялікабрытаніі, падпісвае Статут ААН на цырымоніі ў Доме ветэранаў ваеннага мемарыяла.

*26 чэрвеня 1945 г., Сан-Францыска, ЗША*



# С Т А Т У Т
# Міжнароднага Суда

*Артыкул 1*

Міжнародны Суд, заснаваны Статутам Аб’яднаных Нацый у якасці галоўнага судовага органа Аб’яднаных Нацый, утвараецца і дзейнічае ў адпаведнасці з ніжэйпададзенымі пастановамі гэтага Статута.

# РАЗДЗЕЛ I
# АРГАНІЗАЦЫЯ СУДА

*Артыкул 2*

Суд складаецца з калегіі незалежных суддзяў, выбраных, незалежна ад іх грамадзянства, з ліку асоб высокіх маральных якасцей, якія задавальняюць патрабаванням, што прад'яўляюцца ў іх краінах для прызначэння на вышэйшыя судовыя пасады, або з'яўляюцца юрыстамі з прызнаным аўтарытэтам у галіне міжнароднага права.

*Артыкул 3*

1. Суд складаецца з пятнаццаці членаў, прычым у яго складзе не можа быць двух грамадзян адной і той жа дзяржавы.

2. Асоба, якую можна разглядаць, у прымяненні да складу Суда, як грамадзяніна больш чым адной дзяржавы, лічыцца грамадзянінам той дзяржавы, у якой яна звычайна карыстаецца сваімі грамадзянскімі і палітычнымі правамі.

*Артыкул 4*

1. Члены Суда выбіраюцца Генеральнай Асамблеяй і Саветам Бяспекі з ліку асоб, унесеных у спіс па прапанове нацыянальных груп Пастаяннай Палаты Трацейскага Суда згодна з ніжэйпададзенымі палажэннямі.

2. Што датычыць Членаў Аб'яднаных Нацый, не прадстаўленых у Пастаяннай Палаце Трацейскага Суда, то кандыдаты выстаўляюцца нацыянальнымі групамі, прызначанымі для гэтай мэты іх урадамі, з захаваннем умоў, устаноўленых для членаў Пастаяннай Палаты Трацейскага Суда артыкулам 44 Гаагскай Канвенцыі 1907 года аб мірным вырашэнні міжнародных сутыкненняў.

3. Умовы, на якіх дзяржава, што ўдзельнічала ў гэтым Статуце, але не ўваходзіць у склад Аб'яднаных Нацый, можа прымаць удзел у абранні членаў Суда, вызначаюцца, пры адсутнасці асобага пагаднення, Генеральнай Асамблеяй па рэкамендацыі Савета Бяспекі.

*Артыкул 5*

1. Не пазней чым за тры месяцы да дня выбараў Генеральны Сакратар Аб'яднаных Нацый звяртаецца да членаў Пастаяннай Палаты Трацейскага Суда, якія належаць да дзяржаў – удзельніц гэтага Статута, і да членаў нацыянальных груп, прызначаных у парадку пункта 2 артыкула 4, з пісьмовай прапановай аб тым, каб кожная нацыянальная група ўказала, на працягу пэўнага тэрміну, кандыдатаў, якія могуць прыняць на сябе абавязкі членаў Суда.

2. Ніякая група не можа выставіць больш чатырох кандыдатаў, прычым не больш двух кандыдатаў могуць знаходзіцца ў грамадзянстве дзяржавы, якая прадстаўляецца групай. Колькасць кандыдатаў, выстаўленых групай, ні ў якім разе не можа перавышаць больш чым удвая колькасць месцаў, якія падлягаюць запаўненню.

*Артыкул 6*

Рэкамендуецца, каб кожная група да выстаўлення кандыдатур запытвала думку вышэйшых судовых установ, юрыдычных факультэтаў, прававых вышэйшых навучальных устаноў і акадэмій сваёй краіны, а таксама нацыянальных аддзяленняў міжнародных акадэмій, якія займаюцца вывучэннем права.

*Артыкул 7*

1. Генеральны Сакратар складае ў алфавітным парадку спіс усіх асоб, чые кандыдатуры былі выстаўлены. Апрача выпадку, прадугледжанага ў пункце 2 артыкула 12, толькі асобы, унесеныя ў гэты спіс, могуць быць выбраны.

2. Генеральны Сакратар падае гэты спіс Генеральнай Асамблеі і Савету Бяспекі.

*Артыкул 8*

Генеральная Асамблея і Савет Бяспекі пачынаюць выбары членаў Суда незалежна адно ад другога.

*Артыкул 9*

Пры абранні выбаршчыкі павінны мець на ўвазе, што не толькі кожны выбраны паасобку павінен задавальняць усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да яго, але і ўвесь склад суддзяў у цэлым павінен забяспечыць прадстаўніцтва галоўных форм цывілізацыі і асноўных прававых сістэм свету.

*Артыкул 10*

1. Выбранымі лічацца кандыдаты, якія атрымалі абсалютную большасць галасоў і ў Генеральнай Асамблеі, і ў Савеце Бяспекі.

2. Любое галасаванне ў Савеце Бяспекі, як пры выбарах суддзяў, так і ў час прызначэння членаў пагаджальнай камісіі, прадугледжанай артыкулам 12, праводзіцца без усякага адрознення паміж пастаяннымі і непастаяннымі членамі Савета Бяспекі.

3. У выпадку, калі б абсалютная большасць галасоў была пададзена і ў Генеральнай Асамблеі, і ў Савеце Бяспекі больш чым за аднаго грамадзяніна той жа дзяржавы, выбраным лічыцца толькі старэйшы па ўзросце.

*Артыкул 11*

Калі пасля першага пасяджэння, скліканага для выбараў, адно або некалькі месцаў застануцца незапоўненымі, адбудзецца другое, а ў выпадку патрэбы, і трэцяе пасяджэнне.

*Артыкул 12*

1. Калі пасля трэцяга пасяджэння адно або некалькі месцаў застануцца незапоўненымі, то ў любы час, па патрабаванні альбо Генеральнай Асамблеі, альбо Савета Бяспекі, можа быць склікана пагаджальная камісія ў складзе шасці членаў: трох па прызначэнні Генеральнай Асамблеі і трох па прызначэнні Савета Бяспекі, для абрання, абсалютнай большасцю галасоў, адной асобы на кожнае свабоднае месца і прадстаўленне яе кандыдатуры на разгляд Генеральнай Асамблеі і Савета Бяспекі.

2. Калі пагаджальная камісія аднагалосна спыніцца на кандыдатуры якой-небудзь асобы, што задавальняе пастаўленым патрабаванням, яе імя можа быць уключана ў спіс, хоць бы яно і не было ўнесена ў кандыдацкія спісы, прадугледжаныя артыкулам 7.

3. Калі пагаджальная камісія пераканаецца, што выбары не могуць адбыцца, тады члены Суда, ужо выбраныя, пачынаюць у тэрмін, што вызначаецца Саветам Бяспекі, запаўняць свабодныя месцы шляхам абрання членаў суда з ліку кандыдатаў, за якіх былі пададзены галасы альбо ў Генеральнай Асамблеі, альбо ў Савеце Бяспекі.

4. У выпадку рознасці галасоў суддзяў голас старэйшага па ўзросце дае перавагу.

*Артыкул 13*

1. Члены Суда выбіраюцца на дзевяць гадоў і могуць быць перавыбраны, з тым, аднак, што тэрмін паўнамоцтваў пяці суддзяў першага складу Суда канчаецца праз тры гады, а тэрмін паўнамоцтваў яшчэ пяці суддзяў – праз шэсць гадоў.

2. Генеральны Сакратар, неадкладна пасля заканчэння першых выбараў, вызначае па жэрабю, хто з суддзяў лічыцца выбраным на ўказаныя вышэй першапачатковыя тэрміны ў тры гады і ў шэсць гадоў.

3. Члены Суда працягваюць выконваць свае абавязкі аж да замяшчэння іх месцаў. Нават пасля замяшчэння яны абавязаны закончыць пачатыя справы.

4. У выпадку падачы членам Суда заявы аб адстаўцы гэтая заява адрасуецца Старшыні Суда для перадачы Генеральнаму Сакратару. Пасля атрымання апошнім заявы месца лічыцца вакантным.

*Артыкул 14*

Новыя вакансіі запаўняюцца тым жа парадкам, які ўстаноўлены для першых выбараў, з захаваннем наступнага правіла: на працягу месяца пасля з’яўлення вакансіі Генеральны Сакратар пачынае пасылаць запрашэнні, прадугледжаныя артыкулам 5, а дзень выбараў устанаўліваецца Саветам Бяспекі.

*Артыкул 15*

Член Суда, выбраны замест члена, тэрмін паўнамоцтваў якога яшчэ не скончыўся, застаецца на пасадзе да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў свайго папярэдніка.

*Артыкул 16*

1. Члены Суда не могуць выконваць ніякіх палітычных або адміністрацыйных абавязкаў і не могуць прысвячаць сябе ніякім іншым заняткам прафесіянальнага характару.

2. Сумненні па гэтым пытанні вырашаюцца пастановай Суда.

*Артыкул 17*

1. Ніхто з членаў Суда не можа выконваць абавязкаў прадстаўніка, даверанага або адваката ні ў якай справе.

2. Ніхто з членаў Суда не можа ўдзельнічаць у вырашэнні якой-небудзь справы, у якой ён раней удзельнічаў у якасці прадстаўніка, даверанага або адваката аднаго з бакоў, або члена нацыянальнага і міжнароднага суда, следчай камісіі ці ў якой-небудзь іншай якасці.

3. Сумненні па гэтым пытанні вырашаюцца пастановай Суда.

*Артыкул 18*

1. Член Суда не можа быць адхілены ад пасады, апрача выпадку, калі, па аднагалосным меркаванні іншых членаў, ён перастае задавальняць патрабаванням, якія ставяцца да яго.

2. Аб гэтым Генеральны Сакратар афіцыяльна паведамляецца Сакратаром Суда.

3. Пасля атрымання гэтага паведамлення месца лічыцца вакантным.

*Артыкул 19*

Члены Суда пры выкананні імі судовых абавязкаў карыстаюцца дыпламатычнымі прывілеямі і імунітэтамі.

*Артыкул 20*

Кожны член Суда абавязаны да заняцця пасады зрабіць у адкрытым пасяджэнні Суда ўрачыстую заяву, што ён будзе выконваць свае абавязкі справядліва і добрасумленна.

*Артыкул 21*

1. Суд выбірае Старшыню і Віцэ-Старшыню на тры гады. Яны могуць быць перавыбраны.

2. Суд прызначае свайго Сакратара і можа прыняць меры для прызначэння такіх іншых службовых асоб, якія могуць стаць неабходнымі.

*Артыкул 22*

1. Месцазнаходжаннем Суда з'яўляецца Гаага. Гэта, аднак, не перашкаджае Суду засядаць і выконваць свае функцыі ў іншых месцах ва ўсіх выпадках, калі Суд знойдзе гэта пажаданым.

2. Старшыня і Сакратар Суда павінны пражываць у месцы знаходжання Суда.

*Артыкул 23*

1. Суд засядае пастаянна, за выключэннем судовых вакацый, тэрміны і працягласць якіх устанаўліваюцца Судом.

2. Члены Суда маюць права на перыядычны водпуск, час і працягласць якога вызначаюцца судом, прычым прымаецца пад увагу аддегласць ад Гаагі да пастаяннага месцапражывання кожнага суддзі на радзіме.

3. Члены Суда абавязаны быць у распараджэнні Суда ва ўсякі час, за выключэннем часу знаходжання ў водпуску і адсутнасці з прычын хваробы або па іншых сур'ёзных падставах, належным чынам растлумачаных Старшыні.

*Артыкул 24*

1. Калі па якой-небудзь асобай прычыне член Суда лічыць, што ён не павінен удзельнічаць у вырашэнні пэўнай справы, ён паведамляе аб гэтым Старшыні.

2. Калі Старшыня лічыць, што хто-небудзь з членаў Суда не павінен па якой-небудзь асобай прычыне ўдзельнічаць у пасяджэнні па пэўнай справе, ён папярэджвае яго аб гэтым.

3. Калі пры гэтым узнікае рознагалоссе паміж членам Суда і Старшынёй, то яно вырашаецца пастановай Суда.

*Артыкул 25*

1. Апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных у гэтым Статуце, Суд засядае ў поўным складзе.

2. Пры ўмове, што колькасць суддзяў, якія ёсць у наяўнасці для ўтварэння Суда, не менш адзінаццаці, Рэгламент Суда можа прадугледзець, што адзін або некалькі суддзяў могуць быць, у залежнасці ад акалічнасцей, вызвалены па чарзе ад удзелу ў пасяджэннях.

3. Кворум з дзевяці суддзяў дастатковы для ўтварэння судовага паўнамоцтва.

*Артыкул 26*

1. Суд можа, па меры патрэбы, утварыць адну або некалькі камер, у складзе трох ці больш суддзяў, паводле меркавання Суда, для разбору пэўных катэгорый спраў, напрыклад, працоўных спраў і спраў, якія датычаць транзіту і сувязі.

2. Суд можа ў любы час утварыць камеру для разбору асобнай справы. Колькасць суддзяў, што ўтвараюць такую камеру, вызначаецца Судом са згоды бакоў.

3. Справы слухаюцца і вырашаюцца камерамі, прадугледжанымі гэтым артыкулам, калі бакі аб гэтым просяць.

*Артыкул 27*

Рашэнне, пастаноўленае адной з камер, прадугледжаных у артыкулах 26 і 29, лічыцца вынесеным самім Судом.

*Артыкул 28*

Камеры, прадугледжаныя артыкуламі 26 і 29, могуць, са згоды бакоў, засядаць і выконваць свае функцыі ў іншых месцах, апрача Гаагі.

*Артыкул 29*

Для хутчэйшага вырашэння спраў Суд штогод утварае камеру ў складзе пяці суддзяў, якая, па просьбе бакоў, можа разглядаць і вырашаць справы ў парадку спрошчанага судаводства. Для замены суддзяў, якія прызнаюць для сябе немагчымым прыняць удзел у пасяджэнні, вылучаюцца дадаткова два суддзі.

*Артыкул 30*

1. Суд складае Рэгламент, які вызначае парадак выканання ім сваіх функцый. Суд, у прыватнасці, устанаўлівае правілы судаводства.

2. У Рэгламенце Суда можа быць прадугледжаны ўдзел у пасяджэннях Суда або яго камер асэсараў без права рашаючага голасу.

*Артыкул 31*

1. Суддзі, якія знаходзяцца ў грамадзянстве кожнага з бакоў, захоўваюць права ўдзельнічаць у пасяджэннях па справе, што разглядаецца ў Судзе.

2. Калі ў складзе Суда ёсць суддзя, які знаходзіцца ў грамадзянстве аднаго боку, любы другі бок можа выбраць для ўдзелу ў пасяджэнні ў якасці суддзі асобу па сваім выбары. Гэтая асоба выбіраецца пераважна з ліку тых асоб, якія выстаўляліся ў якасці кандыдатаў, у парадку, прадугледжаным у артыкулах 4 і 5.

3. Калі ў складзе Суда няма ніводнага суддзі, які знаходзіцца ў грамадзянстве бакоў, то кожны з гэтых бакоў можа выбраць суддзю ў парадку, прадугледжаным у пункце 2 гэтага артыкула.

4. Пастановы гэтага артыкула прымяняюцца да выпадкаў, прадугледжаных у артыкулах 26 і 29. У такіх выпадках Старшыня просіць аднаго або, у выпадку патрэбы, двух членаў Суда са складу камеры ўступіць свае месца членам Суда, якія знаходзяцца ў грамадзянстве зацікаўленых бакоў, альбо, пры адсутнасці гэтакіх ці ў выпадку немагчымасці прысутнічаць, суддзям, спецыяльна выбраным бакамі.

5. Калі ў некалькіх бакоў ёсць агульны інтарэс, то яны, паколькі гэта датычыць папярэдніх пастаноў, разглядаюцца як адзін бок. У выпадку сумненняў па гэтым пытанні яны вырашаюцца пастановай Суда.

6. Суддзі, выбраныя згодна з выкладзеным у пунктах 2, 3 і 4 гэтага артыкула, павінны задавальняць умовам, якіх патрабуюць артыкул 2 і пункт 2 артыкула 17 і артыкулы 20 і 24 гэтага Статута. Яны ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў на роўных правах з іх калегамі.

### *Артыкул 32*

1. Члены Суда атрымліваюць гадавы аклад.

2. Старшыня атрымлівае асобую гадавую прыбаўку.

3. Віцэ-Старшыня атрымлівае асобую прыбаўку за кожны дзень, калі ён выконвае абавязкі Старшыні.

4. Выбраныя ў парадку артыкула 31 суддзі, якія не з'яўляюцца членамі Суда, атрымліваюць узнагароду за кожны дзень выканання імі сваіх функцый.

5. Гэтыя аклады, прыбаўкі і ўзнагарода ўстанаўліваюцца Генеральнай Асамблеяй. Яны не могуць быць зменшаны на працягу тэрміну службы.

6. Аклад Сакратара Суда ўстанаўліваецца Генеральнай Асамблеяй па пастанове Суда.

7. Правілы, устаноўленыя Генеральнай Асамблеяй, вызначаюць умовы, на якіх членам Суда і Сакратару Суда прызначаюцца пенсіі пры выхадзе іх у адстаўку, роўна як і ўмовы, на якіх члены і Сакратар Суда атрымліваюць кампенсацыю сваіх дарожных расходаў.

8. Указаныя вышэй аклады, прыбаўкі і ўзнагарода вызваляюцца ад усякага абкладання.

### *Артыкул 33*

Аб'яднаныя Нацыі бяруць на сябе расходы Суда ў парадку, які вызначаецца Генеральнай Асамблеяй.

# РАЗДЗЕЛ II

# КАМПЕТЭНЦЫЯ СУДА

*Артыкул 34*

1. Толькі дзяржавы могуць быць бакамі па справах, якія разглядае Суд.

2. На ўмовах свайго Рэгламенту і ў адпаведнасці з ім, Суд можа запытваць у публічных міжнародных арганізацый інфармацыю, якая датычыць спраў, што знаходзяцца на яго разглядзе, а таксама атрымлівае падобную інфармацыю, якую даюць указаныя арганізацыі па іх уласнай ініцыятыве.

3. Калі па справе, што разглядаецца Судом, яму трэба даць тлумачэнне ўстаноўчаму дакументу якой-небудзь публічнай міжнароднай арганізацыі або міжнароднай канвенцыі, заключанай на падставе такога дакумента, Сакратар Суда паведамляе дадзенай публічнай арганізацыі і пасылае ёй копіі ўсіх пісьмовых спраў.

*Артыкул 35*

1. Суд адкрыты для дзяржаў, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі гэтага Статута.

2. Умовы, на якіх Суд адкрыты для іншых дзяржаў, вызначаюцца Саветам Бяспекі, з захаваннем асобых пастаноў, якія маюцца ў дзеючых дагаворах; гэтыя ўмовы ні ў якім разе не могуць паставіць бакі ў няроўнае становішча перад Судом.

3. Калі дзяржава, нячлен Аб'яднаных Нацый, з'яўляецца бокам у справе, Суд вызначае суму, якую гэты бок павінен унесці на пакрыццё расходаў Суда. Гэта пастанова не прымяняецца, калі дадзеная дзяржава ўжо ўдзельнічае ў расходах Суда.

*Артыкул 36*

1. Да юрысдыкцыі Суда адносяцца ўсе справы, якія будуць перададзены яму бакамі, і ўсе пытанні, спецыяльна прадугледжаныя Статутам Аб'яднаных Нацый або дзеючымі дагаворамі і канвенцыямі.

2. Дзяржавы – удзельніцы гэтага Статута могуць у любы час заявіць, што яны прызнаюць, без асобага аб тым пагаднення, ipso facto, у адносінах да любой іншай дзяржавы, якая прыняла такое ж абавязацельства, юрысдыкцыю Суда абавязковай па ўсіх прававых спрэчках, што датычаць:

a) тлумачэння дагавора;

b) любога пытання міжнароднага права;

c) наяўнасці факта, які, калі ён будзе ўстаноўлены, з'явіцца парушэннем міжнароднага абавязацельства;

d) характару і памераў кампенсацыі, якая належыць за парушэнне міжнароднага абавязацельства.

3. Вышэйадзначаныя заявы могуць быць безумоўнымі, або на ўмовах узаемнасці з боку тых або іншых дзяржаў, або на пэўны час.

4. Такія заявы здаюцца на захоўванне Генеральнаму Сакратару, які пасылае іх копіі ўдзельнікам гэтага Статута і Сакратару Суда.

5. Заявы, зробленыя на падставе артыкула 36 Статута Пастаяннай Палаты Міжнароднага Правасуддзя, якія яшчэ застаюцца ў сіле, лічацца, у адносінах паміж удзельнікамі гэтага Статута, прызнаннем імі юрысдыкцыі Міжнароднага Суда для сябе абавязковай на нясконачаны тэрмін дзеяння гэтых заяў і ў адпаведнасці з умовамі, у іх выкладзенымі.

6. У выпадку спрэчкі аб падсуднасці справы Суду пытанне вырашаецца пастановай Суда.

*Артыкул 37*

Ва ўсіх выпадках, калі дзеючыя дагавор або канвенцыя прадугледжваюць перадачу справы Суду, які павінен быў быць створаны Лігай Нацый, або Пастаяннай Палаце Міжнароднага Правасуддзя, справа паміж бакамі – удзельнікамі гэтага Статута павінна перадавацца ў Міжнародны Суд.

*Артыкул 38*

1. Суд, – які абавязаны вырашаць перададзеныя яму спрэчкі на аснове міжнароднага права, – прымяняе:

a) міжнародныя канвенцыі, як агульныя, так і спецыяльныя, якія ўстанаўліваюць правілы, безумоўна прызнаныя дзяржавамі, што ўступілі ў спрэчку;

b) міжнародны звычай, як доказ усеагульнай практыкі, прызнанай у якасці прававой нормы;

c) агульныя прынцыпы права, прызнаныя цывілізаванымі нацыямі;

d) з агаворкай, указанай у артыкуле 59, судовыя рашэнні і дактрыны найбольш кваліфікаваных спецыялістаў па публічным праве розных нацый, у якасці дапаможнага сродку для вызначэння прававых норм.

2. Гэта пастанова не абмяжоўвае права Суда вырашаць справу ex aequo et bono, калі бакі з гэтым згодны.

# РАЗДЗЕЛ III
# СУДАВОДСТВА

*Артыкул 39*

1. Афіцыйнымі мовамі суда з'яўляюцца французская і англійская. Калі бакі хочуць, каб справа вялася на французскай мове, то рашэнне выносіцца на французскай мове. Калі бакі хочуць, каб справа вялася на англійскай мове, то рашэнне выносіцца на англійскай мове.

2. Пры адсутнасці пагаднення адносна таго, якая мова будзе ўжывацца, кожны бок можа ў судагаварэнні карыстацца той мовай, якой ён хоча; рашэнне Суда выносіцца на французскай і англійскай мовах. У гэтым выпадку Суд адначасова вызначае, які з двух тэкстаў разглядаецца ў якасці аўтэнтычнага.

3. Суд абавязаны па хадайніцтве любога боку даць яму права карыстацца іншай мовай, апрача французскай і англійскай.

*Артыкул 40*

1. Справы распачынаюцца ў Судзе, у залежнасці ад акалічнасцей, або натыфікацыяй спецыяльнага пагаднення, або пісьмовай заявай на імя Сакратара. У абодвух выпадках павінны быць указаны прадмет спрэчкі і бакі.

2. Сакратар неадкладна паведамляе заяву ўсім зацікаўленым асобам.

3. Ён таксама паведамляе Членам Аб'яднаных Нацый, праз пасрэдніцтва Генеральнага Сакратара, а таксама і іншым дзяржавам, якія маюць права доступу да Суда.

*Артыкул 41*

1. Суд мае права ўказаць, калі, на яго думку, гэта патрабуецца абставінамі, любыя часовыя меры, якія павінны быць прыняты для забеспячэння правоў кожнага з бакоў.

2. У далейшым да канчатковага рашэння паведамленне аб прапануемых мерах неадкладна даводзіцца да ведама бакоў і Савета Бяспекі.

*Артыкул 42*

1. Бакі выступаюць праз прадстаўнікоў.

2. Яны могуць карыстацца ў судзе дапамогай даверaных або адвакатаў.

3. Прадстаўнікі, даверaныя і адвакаты, якія прадстаўляюць бакі ў Судзе, карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі, неабходнымі для самастойнага выканання імі сваіх абавязкаў.

*Артыкул 43*

1. Судаводства складаецца з дзвюх частак: пісьмовага і вуснага судаводства.

2. Пісьмовае судаводства складаецца з паведамлення Суду і бакам мемарандумаў, контрмемарандумаў і, калі трэба, адказаў на іх, а таксама ўсіх папер і дакументаў, якія пацвярджаюць іх.

3. Гэтыя паведамленні робяцца праз Сакратара, у парадку і ў тэрміны, устаноўленыя Судом.

4. Усякі дакумент, які прад'яўляецца адным з бакоў, павінен быць паведамлены другому ў засведчанай копіі.

5. Вуснае судаводства заключаецца ў заслухоўванні Судом сведак, экспертаў, прадстаўнікоў, давераных і адвакатаў.

*Артыкул 44*

1. Для перадачы ўсіх паведамленняў іншым асобам, апрача прадстаўнікоў, давераных і адвакатаў, Суд звяртаецца непасрэдна да ўрада дзяржавы, на тэрыторыі якой паведамленне павінна быць уручана.

2. Тое ж правіла прымяняецца ў выпадках, калі неабходна прыняць меры для атрымання доказаў на месцы.

*Артыкул 45*

Справа слухаецца пад кіраўніцтвам Старшыні або, калі ён не можа старшынстваваць, Віцэ-Старшыні; калі ні той, ні другі не могуць старшынстваваць, старшынствуе старэйшы з прысутных суддзяў.

*Артыкул 46*

Справа ў Судзе слухаецца публічна, калі не паступіла іншага рашэння Суда або калі бакі не патрабуюць, каб публіка не была дапушчана.

*Артыкул 47*

1. На кожным судовым пасяджэнні вядзецца пратакол, які падпісваецца Сакратаром і Старшынёй.

2. Толькі гэты пратакол аўтэнтычны.

*Артыкул 48*

Суд распараджаецца аб накіраванні справы, вызначае формы і тэрміны, у якія кожны бок павінен канчаткова выкласці свае довады, і прымае ўсе меры, што датычаць збірання доказаў.

*Артыкул 49*

Суд можа, нават да пачатку слухання справы, патрабаваць ад прадстаўнікоў прад'яўлення любога дакумента або тлумачэнняў. У выпадку адмовы складаецца акт.

*Артыкул 50*

Суд можа ў любы час даручыць выкананне расследавання або экспертызы ўсякай асобе, калегіі, бюро, камісіі ці іншай арганізацыі па сваім выбары.

*Артыкул 51*

Пры слуханні справы ўсе пытанні, якія датычаць справы, прапануюцца сведкам і экспертам з захаваннем умоў, вызначаных Судом у Рэгламенце, адзначаным у артыкуле 30.

*Артыкул 52*

Пасля атрымання доказаў ва ўстаноўленыя для гэтага тэрміны Суд можа адмовіць у прыняцці ўсіх далейшых вусных і пісьмовых доказаў, якія адзін з бакоў пажадаў бы прад'явіць без згоды другога.

*Артыкул 53*

1. Калі адзін з бакоў не з'явіцца ў суд або не прадставіць сваіх довадаў, другі бок можа прасіць Суд аб вырашэнні справы ў сваю карысць.

2. Суд абавязаны, да задавальнення гэтага хадайніцтва, упэўніцца не толькі ў падсуднасці яму справы, згодна з артыкуламі 36 і 37, але таксама і ў тым, ці мае гэта дамаганне дастатковае фактычнае і прававое абгрунтаванне.

*Артыкул 54*

1. Калі прадстаўнікі, адвакаты і давераныя закончылі пад кіраўніцтвам Суда свае тлумачэнні па справе, Старшыня аб'яўляе слуханне законченым.

2. Суд ідзе на абмеркаванне рашэння.

3. Нарады суда праходзяць у закрытым пасяджэнні і захоўваюцца ў тайне.

*Артыкул 55*

1. Усе пытанні вырашаюцца большасцю галасоў прысутных суддзяў.

2. У выпадку, калі галасы дзеляцца пароўну, голас Старшыні або суддзі, які яго замяшчае, дае перавагу.

*Артыкул 56*

1. У рашэнні павінны быць прыведзены меркаванні, на якіх яно абгрунтавана.

2. У рашэнні запісваюцца імёны суддзяў, якія ўдзельнічалі ў яго прыняцці.

*Артыкул 57*

Калі рашэнне, у цэлым або ў частцы, не выражае аднагалоснай думкі суддзяў, то кожны суддзя мае права выказаць сваю асобую думку.

*Артыкул 58*

Рашэнне падпісваецца Старшынёй і Сакратаром Суда. Яно абвяшчаецца ў адкрытым пасяджэнні Суда пасля належнага паведамлення прадстаўнікам бакоў.

*Артыкул 59*

Рашэнне Суда абавязковае толькі для бакоў, якія ўдзельнічаюць у справе, і толькі па дадзенай справе.

*Артыкул 60*

Рашэнне канчатковае і не падлягае абскарджанню. У выпадку спрэчкі аб сэнсе ці аб'ёме рашэння тлумачэнне яго належыць Суду па патрабаванні любога боку.

*Артыкул 61*

1. Просьба аб пераглядзе рашэння можа быць заяўлена толькі на падставе новых абставін, якія па сваім характары могуць аказаць рашаючы ўплыў на зыход справы і якія, пры вынясенні рашэння, не былі вядомы ні Суду, ні боку, што просіць аб пераглядзе, пры той абавязковай умове, што такая недасведчанасць не была вынікам нядбайнасці.

2. Судаводства па пераглядзе адкрываецца вызначэннем Суда, у якім пэўна ўстанаўліваецца наяўнасць новай акалічнасці з прызнаннем за апошняй характару, які дае падставу для перагляду справы, і аб'яўляецца аб прыняцці, з прычыны гэтага, просьбы аб пераглядзе.

3. Суд можа запатрабаваць, каб умовы рашэння былі выкананы, перш чым ён пачне перагляд справы.

4. Просьба аб пераглядзе павінна быць заяўлена да зыходу шасцімесячнага тэрміну пасля таго, як выявяцца новыя акалічнасці.

5. Ніякія просьбы аб пераглядзе не могуць быць заяўлены пасля сканчэння дзесяці гадоў з моманту вынясення рашэння.

*Артыкул 62*

1. Калі якая-небудзь дзяржава лічыць, што рашэнне па справе можа закрануць які-небудзь яе інтарэс прававога характару, то гэта дзяржава можа звярнуцца ў Суд з просьбай аб дазволе ўступіць у справу.

2. Рашэнне па гэтай просьбе належыць Суду.

*Артыкул 63*

1. У выпадку ўзнікнення пытання аб тлумачэнні канвенцыі, у якой, апрача зацікаўленых у справе бакоў, удзельнічаюць і іншыя дзяржавы, Сакратар Суда неадкладна паведамляе ўсім гэтым дзяржавам.

2. Кожная з дзяржаў, якая атрымала такое паведамленне, мае права ўступіць у справу, і, калі яна скарыстае гэта права, тлумачэнне, якое змяшчаецца ў рашэнні, роўным чынам абавязковае і для яе.

*Артыкул 64*

Пры адсутнасці іншага тлумачэння Суда кожны бок нясе свае ўласныя судовыя выдаткі.

# РАЗДЗЕЛ IV
# КАНСУЛЬТАЦЫЙНЫЯ ЗАКЛЮЧЭННІ

*Артыкул 65*

1. Суд можа даваць кансультацыйныя заключэнні па любым юрыдычным пытанні, па запатрабаванні любой установы, упаўнаважанай рабіць такія запатрабаванні самім Статутам Аб'яднаных Нацый або згодна з гэтым Статутам.

2. Пытанні, па якіх запытваецца кансультацыйнае заключэнне Суда, падаюцца Суду ў пісьмовай заяве, дзе дакладна выкладзена пытанне, па якім патрабуецца заключэнне; да яго прыкладаюцца ўсе дакументы, якія могуць дапамагчы растлумачыць пытанне.

*Артыкул 66*

1. Сакратар Суда неадкладна паведамляе аб заяве, у якой выкладзена просьба аб кансультацыйным заключэнні, усім дзяржавам, што маюць права доступу да Суда.

2. Апрача таго, Сакратар Суда пасылае асобае і непасрэднае паведамленне любой маючай доступ да Суда дзяржаве, а таксама любой міжнароднай арганізацыі, якія могуць, на думку Суда (або яго Старшыні, калі Суд не засядае), даць звесткі па дадзеным пытанні, што Суд гатовы прыняць, на працягу тэрміну, што ўстанаўліваецца Старшынёй, пісьмовыя даклады, якія адносяцца да пытання, або выслухаць такія ж вусныя даклады на адкрытым пасяджэнні, якое назначаецца з гэтай мэтай.

3. Калі такая дзяржава, якая мае права доступу да Суда, не атрымае асобага паведамлення, адзначанага ў пункце 2 гэтага артыкула, то яна можа выказаць жаданне даць пісьмовы даклад ці быць выслуханай; Суд прымае рашэнне па гэтым пытанні.

4. Дзяржавы і арганізацыі, якія падалі пісьмовыя ці вусныя даклады, або і тыя і другія, дапускаюцца да абмеркавання дакладаў, зробленых іншымі дзяржавамі ці арганізацыямі, у формах, межах і ў тэрміны, якія ўстанаўліваюцца ў кожным асобным выпадку Судом або, калі ён не засядае, Старшынёй Суда. Для гэтай мэты Сакратар Суда паведамляе ў належны час усе такія пісьмовыя даклады дзяржавам і арганізацыям, якія самі падалі падобныя даклады.

### *Артыкул 67*

Суд выносіць свае кансультацыйныя заключэнні ў адкрытым пасяджэнні, аб чым папярэджваюцца Генеральны Сакратар і прадстаўнікі непасрэдна зацікаўленых Членаў Аб'яднаных Нацый, іншых дзяржаў і міжнародных арганізацый.

### *Артыкул 68*

Пры ажыццяўленні сваіх кансультацыйных функцый Суд, апрача ўказанага, кіруецца пастановамі гэтага Статута, якія датычаць спрэчных спраў, у той меры, у якой Суд прызнае іх прымянімымі.

# РАЗДЗЕЛ V
# ПАПРАЎКІ

*Артыкул 69*

Папраўкі да Статута ўводзяцца тым жа парадкам, які прадугледжаны Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый для паправак да яе Статута, пры захаванні, аднак, усіх правіл, якія могуць быць устаноўлены Генеральнай Асамблеяй па рэкамендацыі Савета Бяспекі адносна ўдзелу дзяржаў, якія не з'яўляюцца Членамі Аб'яднаных Нацый, але з'яўляюцца ўдзельнікамі гэтага Статута.

*Артыкул 70*

Суд мае права прапанаваць папраўкі да гэтага Статута, якія ён прызнае неабходнымі, паведамляючы іх пісьмова Генеральнаму Сакратару для далейшага разгляду згодна з правіламі, выкладзенымі ў артыкуле 69.




Плакат са Статутам ААН. Копія першай старонкі з тэкстам Прэамбулы, першыя пяць подпісаў, апошняя старонка і сертыфікат Статута ААН.

*1 снежня 1950 г., Арганізацыя Аб’яднаных Нацый, Нью-Ёрк*

**Статут**
**Арганізацыі Аб’яднаных Нацый**
**і Статут Міжнароднага Суда**

*Да 75-годдзя з дня падпісання Статута Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, 26 чэрвеня 1945 г., г. Сан-Францыска, ЗША*

**Выдадзена па заказе Арганізацыі Аб’яднаных Нацый у Беларусі.**


© Фота: Арганізацыя Аб’яднаных Нацый



Адказны за выпуск В.У. Радзівіноўскі
Карэктары В.І. Уласевіч, М.У. Сульдзіна
Дызайн, вёрстка С.У. Скіндзер

Падпісана да друку 19.06.2020.
Папера афсетная. Афсетны друк.
Умоўн. друк. арк. 10,5. Ул.-выд. арк. 8,7.
Тыраж 200 экз. Заказ 469

ТАА «РЫФТУР ПРЫНТ»
Пасведчанне аб рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/284 ад 09.04.2014.
Пр-т Пераможцаў, 19а, 220004, Мінск.

УП «ДЖЫ ЭНД ДЗІ»
Пасведчанне аб рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/36 ад 13.01.2014.
Вул. Бурдэйнага, 37, 220136, Мінск.